КАЛОСЬСЕ

III

ВІЛЬНЯ 1939

„KAŁOŚSIE“ — KWARTALNIK LITERACKO-NAUKOWY

«КАЛОСЬСЕ»—беларускі літаратурна-навуковы і грамадзкі часапіс. Выходзіць раз у тры месяцы. Складка ў год—2 зл.
— Заграніцу 3 зл. 20 гр., Асобная кніжка — 50 гр. —

Адрас рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Завальная вул. 1—2.

«KAŁOŚSIE» — białoruski literacko - naukowy i społeczny kwartalnik. — Wilno, Zawalna 1—2.

«KALOŚSIE» — blancruthenienne revue trimensuelle litteraire et scientifique. Wilno, Zawalna 1—2. Pologne.

Ад Рэдакцыі:

Чарговы, чацьверты нумар „Калосься" ўжо ў друкарскім наборы. Прысьвячаецца ён юбілею 25-тых угодкаў сьвяшчэнства й нацыянальнай дзейнасьці заслужанага беларускага дзеяча Ксяндза Адама Станкевіча. Усіх В. Паважаных Супрацоўнікаў нумару ветліва просім паруліцца прыслаць матарыял да 15 жніўня.

У нумары будуць зьмешчаны публіцыстычныя артыкулы, літаратурна-мастацкія матарыялы й прывітаньні.

Зьмест кніжкі 3 (20) „Калосься"

(Працяг зьместу на 3 бач. вокладкі)

Drukarnia Białoruska im. Franciszka Skaryny — Wilno, ul. Zawalna 1

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ І ГРАМАДЗКІ ЧАСАПІС

КНІЖКА 3 (20). ЛІПЕНЬ-ЖНІВЕНЬ-ВЕРАСЕНЬ, 1939. ГОД V.

МАКСІМ ТАНК

ЧАКАЕМ СОНЦА

Чакаем сонца. Сьцеліцца туман,
плыве з палос рунеючых, з вазёраў
на дрот заснуўшы, на густы паркан,
і тонуць цені стражнікаў і зоры.

Павук жалезны пераплёў акно.
А мы Гімн Сонцу пішам на граніце.
І кожны раз, як загрыміць зьвяно,
па камню прабягаюць бліскавіцы.

Пакуль угледзяць — бурай веснавой
напеў наш будзячы зару празвоне,
калі заглушаць, — іншыя, начой
устаўшы, песьню высякуць ў бэтоне.

І хто-б з асеньніх сьцежак ня прыйшоў,
знайдзе шрамы і зьмест іх адчытае,
і не засьне!.. І будзе ноччу зноў
ад зьвеньняў цэгла сыпацца сырая.

Вільня, 11.VI.39.

У зялёным Лагу

(З паэмы „Сілаш Істома“

Адлігі шызы вецер кружыць,
гне вішнякі.
І сыплецца з краплёў у лужы
густы блакіт.
Усюды цёплых капляў поўна, —
плывуць з вакон.
Хтось можа згубленае ўспомніць
пад гэты звон.
Ці моладасьць, ці вуснаў проблыск,
ці васількі;
спагаду шчырую і добры
прывет блізкіх.
Але мяне хвалюе радасьць,
вясна бяроз,
што вецер нівам, палісадам
з сабой прынёс;
што залацісты сонца кужаль
прадуць смыкі...
І сыплецца з краплёў у лужы
густы блакіт.

Плугі чакалі скібаў чорных,
каб змыць іржу, а людзі выглядалі вырай.
У пуні патруху канчалі мышы,—корму
не хапала.
Пусьцела варыўня і сьвіран.
Туман каровы жвалі раніцамі прэсны,
аж пакуль збуджаная куліковай песьняй
за шыпаўкай на сініх ад паводкі тонях

зазелянела смычка, загарэўся лопух.
Зялёным лугам поўзалі
і шэлясьцелі слухі
пра перадзел зямлі... А посьле —
глуха замёрла ўсё, калі ля Переброда
з начальствам затрымаліся разводы.
На стол з скуранай торбы падарожнай
пан Крым выкладваў паперы асьцярожна:
нядоімкі,
наказы,
кары, кары...
У хаце ціха. На аполкі нараў
луска цярушыцца з вянкоў цыбулі.
Праз шыбы сонца звоне па кашулях.

Гавора стараста, зьбіваючыся з толку,
і шум раіцца.
З нізкага пяколку
дымяць анучы сохнучыя.
— Лагавяне!
Успомніце мяне і словы пана.
Папраўцеся! Палітыка вам шкодзе.
Газэты шкодзяць. Што вам прыйшлося
з сваіх лемантароў? На лапаць сойдзе
жыцьцё. Хіба не пагусьцела ў саганох зацірка?
Глядзеце! не зьмяніце гузіка на бірку...
Тут солтыс выцер потны твар насаткай,
глынуў вады з надбітай, вышчарбанай шклянкі,
закашляўся.
— Усё гэтак, пане«бортніку».Вось горай,
што ваша праўда вельмі дарагая...
. . . .
Нясьпелыя чарэшні —
вочы пана Крыма злосьцю дасьпяваюць
ад шуму і ад словаў Пераброда.
Але пачуўшы ў хаце непагоду,
сачыць за ветрам слоў і пачынае
спакойным голасам, прыхільным нават:
— Я сам з сялян і шчыра спачуваю...
(Паправіў гальштук, пачакаў на лаве,
пакуль ня сьцішыліся бабы). Знаю, —
цяжка справіцца вам з платай можа,
ўсё-ж трэба радзіць неяк.
Ну разложым
бяду на раты,
месяцы,
на грошы...
Ды цішыня пярэчыць і трывожыць.
Пан Крым на іншых пачынае нотах
саліраваць.
А думы вашы — радзіў-бы пакінуць!
Дарма вы паліваеце іх потам!
Ім ня цьвісьці і не гарэць рабінай!
Дарма іх крыеце і даеце прытулак
пад латамі сярмяг, у хатах цесных,
і завяшчаеце у спадчыне,—і ў песьнях
іх акрыляеце вятроў трывожных гулам.
Дарма! ня прыслухайцеся зямлі зялёнай!
Ня чулі, як зьвініць сьвірэпка, хвошч з аірам?
Не углядайцеся ў даль сінюю загонаў: —
не надляціць жалезная стуль вырай!
Лягчэй бяз гэтых дум і вам і коням
было-б па полі валачыць смыкі — бароны!..

Ля качарэжніку сьмех іскрачыся пырснуў
у цішыню смалістую, сухую,
і раптам хату ахапіў, да зьвісшай
нізка столі.
Сьмяяліся і тыя,
што бачылі, як дзед Сьцяпан старую
нязгасшай люлькай прапаліў сярмягу;
сьмяяліся і ля стала перадавыя
ня бачыўшыя гэта...
Моцнай брагай
сьмех накіпаючы рваў абручы бярвеньня.
І толькі зразумеў пан Крым, што немагчыма
сьмяяцца так людзям і гэтым сьценам,
з прапаленай палы ці з дыму, —
падняўся з лавы, быццам з лодкі бераг
хацеў убачыць.
Але, дзе там!
Шумела хата хвалямі і ветрам.
Нэрвова алавік забегаў па паперы.
— Запісвае нешта...
— Нас, ці мо скаціну?..
На твары солтыса застыла у маршчынах
усьмешка хітрая...
Відучы радзела
у хаце Перабрада.
Расходзячыся маладзіцы
перашэптваліся яшчэ нясьмела
аб тым, што зноў у Кацярыны
стан поўны пераціснуўся спадніцай,
аб снох...
А сухавей у полі сіні
ўжо брэд страсаў і па барознах глею
звон яравы —
звон жаваранка
сеіў.

Пад вечар хмарылася. Красіво маланкі
ударыла ў сівы памежны камень.
З дварышча Перабрада, з ганку,
відаць было, як густа за такамі
і весела закурыўся дождж. Бойка
агатавыя каплі зьбягаюць па саломе
паросшай мохам, па паплёце, звонка
разьбіваючыся.
І хоць цёмна
было чытаць, мо' раз дзесяты
Сілаш перабягаў пісьмо і новым
нечым веяла ад словаў Марты...

— Зноў распагодзіцца... Дождж не надоўга...
— За Ляда хмару цёмную пагнала.
— А што чуваць у горадзе? Ня пішуць?
— Мо' не адзін чытаць з пісьма вучыўся,
пакуль дайшло...
— Так. Шмат дзе пабывала! —
Сілаш складае зьмятую паперу.
Ў канвэрт хавае. — Пішуць, — неспакойна
штрайкуюць фабрыкі... У змроку шэрым
Сілаш рысуе вобразы змаганьня,
за тыя думы, што вясьняна звоняць,
за тую праўду, што сусьветным зьзяньнем
гарыць у сэрцах, на сьцягох працоўных...
— Вось толькі мы яшчэ маўчым, хоць даўна
пабоцні муляюць, горам каласяцца
жыты на нашых матузох пяшчаных.
І нашым сохам недзе разгуляцца.
І песьням крыльлі скручваюць лыкам.
І цесна ўжо на прадзедаў абшарах,
хоць дрэміць ніваў акіян вялікі,
хоць мейсца шмат ёсьць і вятрам і хмарам...

Спаткаўся з поглядам маўклівым Зосі.
— Чаго яна угледзілася дзіўна?
Заслухалася можа, як маросіць
дождж камарынай талакой над прыўнем?
Славом з пісьма? —
Не! у пісьме ад Марты
нат' мала ўспамінаецца пра тое,
аб чым ён гаварыў. Там польнай мятай
славы цьвітуць, а гэтыя зарою...
Усьмешку затуліўшы хусткай
ад баб і ад дажджа, што густа
яшчэ раіўся каля стрэх, праціснулася Зося.
— Сьпяшаешся ты, як да маладога!
— Пастой! — жартуюць.
Моўчкі босай
лужыны перабрыла і толькі ногі
вада сьцюдзёная лізнула за калені.

Зноў паясьнела.
На шнуры вузкія
ідзе сявец і гаспадарскай жменяй
у змроку зоры сее яравыя.
Адны гарадь ужо над цёмным Лядам,
другія — ў Шыпаўцы між трасьнікамі тонуць...
Сілаш заслухаўся, як вяснавая радасьць
нахлынуўшая сэрцам звоніць.

І першы раз у гэтай песьні вычуў
прастор зямлі расцьвіўшай—безгранічны,
напевы думаў, скрытых і свабодных,
і тую сілу, што ламае краты,
і тое сонца, што у сказах родных,
і зьзяньне простых, ціхіх словаў Марты.

Ідзі па барознах усходам,
па грудах расцьвіўшых і росных:
пачуеш, як звоняць і бродзяць
набракшыя песьнямі вёсны.
Як сонца пад ветру павевы
зярнятамі цёплымі сыпіць,
і сей, калі маеш насевак,
які можа коласам выплыць.
Які у нядолю, гароту
сяўцоў і надзеі прыпомніць
цяжкім, залатым умалотам
асыплючыся
на далоні.

МІХАСЬ МАШАРА

Вясна на балотах

I

Апалі на думы мае нагаворы,
вясьняныя шолахі сініх балот.
Люстранае поле —
прасторы вазёраў,
дзе ціха сумуе ў затоках чарот.

Саджуся пад сосны...
на берагу дзікім,
гуторыць з вятрамі пад шум асакі.
Пытаецца каня сумуючым крыкам:
калі на вазёры прыдуць рыбакі?..

Тут дваццаць пяць тысяч гэктараў балота
і семьдзесят восем бяз назвы вазёр
чакае вякамі людзкога прыходу,
каршун толькі ў небе —
вартуе прастор.

Ваўчыха... лісіца... і розныя гады
на сініх балотах, — улада уся.
І краскі,... і песьні,...
і сьмерць ідзе радам,
завець небясьпека —
і радасьць жыцьця

II

Багун зацьвіцеў,...
                    як сьнягі на балотах,
і сіняя засень пад сосны лягла.
Вясной ўсё жывое шукае пяшчоты,
і радасьці хочыць,...
                    і хочыць цяпла.

Па мхах... па дрыгве
                    і па верасу сінім,
бяз троп і бяз сьцежак
                    праходзіць вясна,
і дрож заплятае у лісьце асіны
і сонцам таргуе ля кожнага пня.

Вярнуліся гусі з далёкага краю,
крычаць пераклічам на мху журавы.
І сэрца расьце,...
                    і здаецца згарае
і выславіць хочыцца
                    шолах жывы, —

паняць усю тайну нямую вазёраў,
тугу векавую,
                    і сумы балот
і выткаць у песьні красу іх узорам,
узорам,
                    што тчэ ідучы веснаход.

Ваколіца сініх балот.
Май, 1939 г.

* * *

Сіняе неба, —
                    як вочы дзяўчыны,
хмаркі за кужаль бялёны бялей,
вочы мае напіліся язьмінам, —
успыхнула радасьць у сэрцы ярчэй.

Плавіцца зелень у соўнечным моры.
Сонца цьвіціць на маіх валасах.
Вершам ня сьніліся тыя узоры,
што у размаху —
                    выводзіць каса.

З чым параўняеш у песьні Краіну?
Столькі язьміну і маку цьвіціць!
Гэнь, над Дзьвіною
                    і Нёманам сінім
сяньня нат' гора цяжкое — маўчыць!

С. ХМАРА

Курапачы вывадак

Дзевяцёх запрэжаных у чатыры бочкавозы людзей бегла напружваючы сілы па чырвонай з бітае цэглы дарозе.

У далечыні, за сінеючай смугай лесу, хавалася вячэрняе сонца, залоцячы апошнімі праменьнямі вярхі стагодніх мадрын.

Па чырвонай дарозе бегла дзевяцёх людзей...

У перадвячэрняй цішы замерлай як-бы ў маліцьве прыроды блюзгала чорным балотам жахлівая, агідная лайка прыгоншчыкаў.

Глуха бубнілі сваю незразумелую песьню бочкавозы...

Беглі людзі...

— —

Маці-курапатка па неспакойным дні, калі трэба было зашыцца з вывадкам ў найглушшы кут пры агарожы, перад дзіўнымі несамавітымі рыкамі, цэлы дзень б'ючымі, адтуль — там з пад тыхаграмадных, сьляпых будынін — пастанавіла вывесьці дзяцей на пажыву.

Клохчучы, трывожна бегла за шэрымі, маленькімі жывымі камочкамі, перасьцерагаючы іх на сваёй курапачай мове перад страшліваю чырвонай дарогай, па каторай — бачыла ня раз—з рыкам бегалі, поўзалі нейкія страшлівыя істоты, астаўляючы па сабе яшчэ чырванейшыя стругі, чым сама дарога.

А курапацятам уласьне яна падабалася!

Бо такая іншая, як усё навокал.

Такая дзіўная!

А там—у канцы дарогі, — такая смачная вада, капаючая неаткуль з гары і паўзучая вузенькаю серабрыстаю зьмійкаю між каменьчыкаў...

Клохкала з перапалоху пасьпяшаючая за непаслушнымі малымі курапатка.

Дарогай з далёк дуднілі запрэжаныя ў людзі бочкі.

— —

...За 15 мінют, каб былі поўныя!

Або!...

—...Бразнулі пагрозьліва словы, малюючы ў уяве змучаных вазакоў кашмарную візыю кароткага „або"...

Кінуліся да манежа, схапіліся за шлеі...

—Бягом!...

Несьцярпіма забалелі — усе ў сініх шнарох — плечы...

— —

На курапачы вывадак, што раскашаваўся пад кранам халоднай вадой, раптоўна з аглушаючым лоскатам, грымотамі выскачылі людзі з бочкамі...

Уцякаць было позна. На сыгнал маткі сыпнула дробязь пад манежныя перадачы.

Старая прытаілася вобак у траве.

— —

Рванулі шлеі. Заскрыгатаў дышаль манежа... Захрыпела кола.

І раптам між гэных зыкаў раздаліся цененькія, плаклівыя піскі нечага жывога...

Глянулі маўкліва сабе ў вочы, дрыганулі й сталі...

Распачліва заквохкала, выскачыўшы з травы, старая.

Перапалоханыя малыя курапацята бязпомачна пішчэлі — скаржыліся застрагшы ў манежных перадачах...

Замахнуўшаяся да удару рука затрымалася раптам на паўдарозе пачуўшы слабенькія піскаты...

А ўбачыўшы малое курапацяня што бязпомачна караталася між манежных пераваг, кінуў неспадзявана — ўсупярэч усім уставам—ў бок сваю вінтоўку—і палез на карачках пад манежнае кола...

За мінюту каля першага поўзаў і другі вартаўнік — забыўшыся аб пільнаваньні паняволеных...

За імі палезьлі й паняволеныя. Навакол перапалоханая, быццам звар'яцелая, бегала кудахкаючы старая курапатка...

Пячотліва трымаючы ў далонях вынасілі па аднаму цэлы вывадак па за манежны ток і ўглядаліся, як няздарна апіраючыся на свае бязпёрыя крылцы беглі малышы на голас маткі.

Задумаўшыся аб чымсь стаялі, маўкліва углядаючыся на гінучы ў траве вывадак, вартаўнікі.

Забылі аб уставе... аб службе... Мусіць успомнілася ім далёкая адарваная і ад іх сям'я... дзеці...

Вогкім бліскатам зацягнуліся вочы паняволеных...

Яны таксама ўспомнілі!

Пад апошнімі праменьнямі сонца чырванела крывавай, злавешчай ракой — цагляная дарога...

...Ўструхануўся. Глянуў на тых, якія ня лічыліся тут за людзей... Над якімі любіў гэтак больна пазьдзеквацца са зьвярынай, бязмыснай жорсткасьцю...

Дрыгнула чамусь сэрца.

А гэта-ж і яны недзе там маюць сваіх матак... дзяцей...

І з захрыплага ад вечнай брутальнай лаянкі горла неспадзявана, мякка адазвалася: ну, хлопцы! — трэба неяк нам і вады накруціць...

А вочы глядзелі неяк саромліва... вінавата...

Далёка... далёка ў траве кудахкала курапатка...

На зямлю спускалася летняя, душная ноч.

У далёкай дарозе...

Зьмяркала.

Сутунак навеяў думкі аб далёкай роднай вёсцы...

Аб шумлівым моры каласуючага жыта...

Аб чыіхсьці кахаючых, маладых вачох...

Аб той радасьці горка-палыннай, мужычай...

І там недзе з пад сэрца, мімахоць навеяная хвілінай,—палілася паўголасам песьня:

...Салавейка шчабеча...
ды зязюлька кукуе.

Падхапіў другі голас:—

Ды хто знае, ды хто ведае,
дзе мой мілы начуе...

Заўтаравала ціхутка з размрыенымі вачыма стоючая ў вакне група. На фоне вячэрняга крывавячага захаду ўбіліся нажамі ў неба гатыцкія вежы недалёкага касьцёлу.

У далёкай дарозе —
сьцеражы яго Божа.
Калі-ж ў дзеванькі, у сьвятліцы,
пакарай яго Божа...

Халоднае, чужое хмурылася няспрыйліва неба...

За мурам у наступіўшай па песьні цішыні пачуліся нейкія дзіўныя зыкі—ўсхліпы...

Нехта плакаў... А потым,— там, з надворку — пачуўся ўстыдлівы шопат пабеларуску:

— Засьпявайце яшчэ!..

— Засьпявайце!...

Пры муры замёршы ў просячым чаканьні рысавалася хвігура вартаўніка.

— Засьпявайце!...

Ды маімі слаўцамі,
ды маімі сьлязцамі.
На што-ж ён мяне ды пакінуў
сам, з малымі дзяткамі...

Жалілася, плакала песьня.

Напружана выцягнуўшы шыю, лавіў вартаўнік апёршыся на стрэльбу словы.

Даўно ўжо змоўкла песьня, а вартаўнік непарушна, занямела стаяў на мейсцы.

І раптам у напрамку акна паліўся гарачковы няпрытомны, балючы шопат, — паўстогн-паўплач. —

— Так, браткі!...

Так!...

Зрадзіў! Усё зрадзіў! Для выгаднага жыцьця! Для грошаў! І жонку... і дзеці... і край...

Нават мову вось тут забываць стаў!...

Эх! Хлопцы, хлопцы!

Душу мне перавярнула родная песьня...—рваліся словы балючай споведзі...

Ці вы мяне чуеце?!...

Ці я заслужу калі прабачаньне?!

А недзе сьляпая ў сваім трыумфе ўрачыста грымела праз вакно мэлёдыя Дамброўскага...

Паролі неба нажамі гатыцкія вежы...

На захадзе разьлівалася кроў.

---

*
* *

Ўзьняўся вецер, вядзьмар злы, далінамі,
паабтрос цьвет лісточкі калінавы,
пакруціў, паламаў бел-бярэзіны,
гарцы ў полі рабіў...
злы гарэзіны.
Гэй, ня вецер там ў полі, а вёскаю
звоніць сталь. Ў неба б'е адгалоскамі.
Заламала дзяўча рукі белыя,
матак вочы ў агні ачумелыя.
Гэй, ня хмара у полі дымілася —
пад лапцямі дарога курылася,
у гары чайка білася, плакала,
вецьце лоз за сярмягі іх лапала.
Ногі, быццам калоды, падвешаны...
І шумелі...
шумелі алешыны.

1938.

*
* *

Што вы багацтвам пышніцесь сваім?
Золата...
пэрлы...
палацы... —
з золата косамі сонца
ці-ж ім
можна калі параўняцца?

Золата маеце?
Сонца маё!
Зорам ці-ж роўныя пэрлы?!
З цудам вясновым палёў і гаёў —
Вашы палацы.... —
мізэрны!!!

Я-жа над імі і пан і ўладар,
дзе-ж вам са мною раўняцца!
Жменяй — хачу — зораў кідаю жар,
сонечных косаў багацтвам.

Вашым Лінкольнам мяне не здагнаць
з тройкай вятроў буйнашпаркіх.
Вашы кілімы ці-ж можна зраўняць
з ніў хараством цьветапалкім!?

Нівы,
то-ж неба маёвы блакіт
зьвіхрыць кроў лепш за шампана,
зачаруе чарэмшыны белая ўскіп,
салаўя трэль калыша да рана.

Калі голад дакучыць... —
здыму
з неба месяца пшонну аладку
і са смакам ўплятаці вазьмусь,
ды нап'юсь неба
з зорнае кладкі...

Бо я пан із паноў, я — ўладар,
дзе-ж са мною каму там цягацісь.
Маё ўсё:
ніў...
лясоў...
п'яны чар,
сонца...
неба блакіт...
зораў гаць.

А. ІВЭРС

З песьняй

Можа знаеце, —
песьня
дае сілаў прыліў.
Гляньце,—сьмелыя весьляць: —
паплылі,
паплылі...

Дык чаму не пацешыць
маладую пару, —
між лазы і алешын
раскудзеліць зару?

Хай
сягоньня мы гнёмся, —
ды ня ломімся ўсе!
Але вось —
зарунеўся
маладняцкі засеў!

І на той на дарозе,
што палын заглушыў,
з песьняй мы пабарозьнім
камяністую шыр.

Хтось расчэсваў зялёныя сосны

Хтось расчэсваў зялёныя сосны,
што адкінулі кудры назад. —
Аб тых ночах смалістых і росных
я ніяк не магу расказаць.

І хоць сёньня ўсхвалёваны ранак
паліць смагаю мяккую сінь,
але ўсё-ж сумаваць яшчэ рана,
калі можна падняць парусы!

А што далі імгляцца тугою —
гэта толькі сінеецца дым, —
рассьпяваная медзь пад дугою
ня пытае, чаго і куды...

З процьмы думак—ня вытканых кроснаў
застанецца узор — дзераза...
Былі ночы — іх зблыталі сосны,
што адкінулі кудры назад...

Я. КУРГАН

У дзесятыя сумныя ўгодкі...

Сёлета мінае дзесяць год ад запачаткаваньня жорсткага прасьледу беларускага культурнага будаўніцтва ў Савецкай Беларусі. Вялікадзяржаўніцкая Масква не магла глядзець спакойна на тыя парасткі маладой беларускай культуры й навукі, якія зарунелі ў Сав. Беларусі ў першым дзесятку гадоў яе існаваньня. Пад відам барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, з г. зв. беларускай нацдэмаўшчынай, яна ў 1929 г. пачала рашуча змагацца з усімі праявамі беларускага нацыянага пачуцьця й думкі, з праявамі беларускай нацыянальнай асобнасьці й самастойнасьці. Галіна духовага, творчага жыцьця беларускага народу — культура, навука, мастацтва, — увесь г. зв. ідэолёгічны фронт, першым чынам сталася арэнай гэтай барацьбы.

Ад 1929 г. барацьба з беларускай нацдэмаўшчынай у Сав. Беларусі сталася зьявішчам пэрманэнтным, хранічным. Яна трывае да апошняга часу, да сяньняшняга дня. У выніку гэтай барацьбы сотні й тысячы беларускіх інтэлектуальных працаўнікоў зьліквідаваны, выгнаны з роднага краю, многія высланы на Салоўкі ці растраляны, а ўвесь прадукт іхняй мазольнай працы сканфіскаваны.

Вялікадзяржаўніцкая Масква, змагаючыся з беларускім нацыянал-дэмакратызмам у галіне літаратурна-мастацкага творства, ставіла закід беларускім савецкім літаратарам, што яны мастацкім словам выражалі беларускі патрыятызм, прапагавалі тэорыю бязклясавай беларускай нацыі, ідэалізавалі ідэю беларускай агульнанацыянальнай самабытнасьці, нацыянальны романтызм, выражалі эстэтычныя тэндэнцыі, формалізм, нацыянальную экзотыку, стылізатарства, псыхолёгізм і т. п. Закіды, як бачымо, цалком паважныя, — у варунках савецкіх, пры сыстэме маскоўскага палітычнага й культурнага цэнтралізму. Але калі зьвернем увагу на тое, што побач успомненых „нацдэмаўскіх" элемэнтаў у беларускай савецкай літаратуры знаходзім выражэньне элемэнтаў абавязуючай у Саветах ідэолёгіі дыктатуры пралетарыяту, выражэньне ідэяў і тэндэнцыяў камунізму-ленінізму і савецкага „пралетарскага" будаўніцтва, а таксама калі зьвернем увагу на тое, што ўся культурная работа Беларусаў у Савецкай Беларусі была узгодненая з асновамі ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, то закіды пастаўленыя Масквой беларускай савецкай літаратуры будуць пазбаўлены ўсякага абаснаваньня. Каб адкінуць гэтыя неабаснаваныя закіды, ня трэба так-жа забывацца аб тым, што агулам беларуская адраджэнская творчая думка наскрось прасякнута прагрэсыўнымі ідэямі, што новая, маладая беларус-

кая культура зьяўляецца наскрось дэмакратычнай, што яна тварылася й творыцца інтэлектам і мазольнай рукой прыгнечанага доўгімі вякамі паншчыны беларускага працоўнага народу, што яна выражае тэндэнцыі беларускага нацыянальнага, соцыяльнага й культурнага вызваленьня. Барацьба з гэткай культурай ужо з гледзішча марксізму і ленінізму, тэорэтычна бяручы, ёсьць зьявішчам недапушчальным і не павінна знаходзіць месца ў Саветах, на дадзеным гістарычным этапе.

Ленін яшчэ ў 1916 г. пісаў:

„У заходніх краінах нацыянальны рух — даўняе мінулае. „Бацькаўшчына" ў Англіі, Францыі, Германіі і г. д. ужо прасьпявала сваю песьню, адыграла сваю гістарычную ролю, г. зн. прагрэсыўнага, узьнімаючага да новага эканамічнага й палітычнага жыцьця новыя масы людзей тут нацыянальны рух даць ня можа. Тут на гістарычнай чарзе дня стаіць не пераход ад феадалізму, або ад патрыярхальнай дзікасьці да нацыянальнага прагрэса, да культурнай і палітычнай вольнай бацькаўшчыны, а пераход ад зжыўшай сябе капіталістычна перасьпелай „бацькаўшчыны" да соцыялізму.

На Ўсходзе Эўропы справа стаіць інакш. Для Украінцаў і Беларусаў, напрыклад... абуджэньне мас да аваладаньня роднай мовай і яе літаратурай ...тут яшчэ адбываецца. „Бацькаўшчына"—тут яшчэ не прасьпявала ўсей гістарычнай песьні. „Абарона бацькаўшчыны" яшчэ можа быць тут абаронай дэмакрацыі, роднай мовы, палітычнай свабоды супроць прыгнятаючых нацый"... (Ленін, том XIX твораў; цытую за Лім, № 55, ад 27.X.1937 г.)

А вось што пісаў Сталін у кнізе „Марксызм і нацыянальнакаляніяльнае пытаньне":

„Нацыя можа устроіцца паводле сваей волі. Яна мае права наладзіць сабе жыцьцё на прынцыпах аўтаноміі. Яна мае права ўступіць у фэдэратыўныя сувязі з другімі нацыямі. Яна мае права нават зусім аддзяліцца. Нацыя сувэрэнная і ўсе нацыі роўнапраўны". (Цытую за часапісам „Просвещение национальностей", № 4, 1935).

А што азначае адзін з першых канстытуцыйных актаў— „Дэклярацыя праў народаў Расеі", падпісаная Лінінам і Сталінам у сьнежпі месяцы 1917 г., у якой аснаўнымі прынцыпамі зьяўляюцца роўнасьць і сувэрэннасьць народаў у Расеі, — права на свабоднае самаазначэньне, улучна да аддзяленьня й стварэньня самастойнага гаспадарства, скасаваньне ўсякіх нацыянальных і нацыянальна-рэлігійных прывілеяў і агранічэньняў, свабоднае разьвіцьцё нацыянальных меншасьцяў і этнографічных групаў? А пазьнейшыя канстытуцыйныя й іншыя праўнапалітычныя акты, — ці не гвасантуюць свабоды разьвіцьцю народам б. царскай Расеі?!

Так, усе яны гварантуюць, але на паперы, усе яны зьяўляюцца толькі пустой дэмагогічнай пісанінай.

Барацьба з нацыянальнымі рухамі ў Саветах, у тым ліку й з беларускім нацыянальным рухам, сьведча аб банкроцтве нацыянальнай палітыкі ў Саветах. Гэтая нацыянальная бальшавіцкая палітыка сталася ня чым іншым, як аружжам русыфікацыі ўсіх нацыянальнасьцяў СССР, сталася прыладзьдзем расейскага вялікадзяржайніцкага шовінізму й імпэрыялізму.

І сапраўды, трэба згадзіцца з думкамі нейкага прафэсара Устралава, які, паводле Авербаха (гл. артыкул Авербаха ў „Маладняку" з 1931 г.), гаворачы аб місіі бальшавізму, цьвердзіць, што бальшавізм мае ў Расеі выканаць функцыі зьбіраньня й захаваньня адзінай і недзялімай Расеі.

Але ці выканае гэтыя функцыі? Нам здаецца, што не. У народаў СССР хопіць адпорнай духовай сілы, каб адкінуць і перамагчы імпэрыялістычныя апэтыты Масквы, каб захаваць сваю індывідуальнасьць.

Барацьба з беларускім нацыянальным рухам у Савецкай Беларусі, зразумелая рэч, выклікала рэакцыю з боку Беларусаў. Выражэньне гэтай рэакцыі знаходзім мы і ў беларускай савецкай літаратуры.

У гэтым нумары „Калосься" перадрукоўваецца паэма «І пурпуровых ветразей узьвівы» — пяра ўталентаванага беларускага паэта Уладзімера Дубоўкі, зьліквідаванага Масквой у 1929 г. Паэма зьяўляецца сатырай на палітычныя адносіны ў Савецкай Беларусі перад дзесяцьцю гадамі, зьяўляецца дакумэнтам абароны самастойнага разьвіцьця беларускага літаратурнага творства ад націску Масквы, выражае прынцыпы барацьбы за свабоду ў творстве, за паказ і патрэбу выяўленьня ў мастацкім слове акрасаў Беларусі — скарбаў беларускай народнай творчасьці. Аўтара паэмы, як і ўсіх беларускіх паэтаў, змушала савецкая казённая крытыка перабудавацца, „ачысьціцца" ад розных ідэолёгічных „ухілаў", уступіць на шлях творства згодны з маскоўскай палітыкай ў Беларусі. У паэме знаходзім адказ — горкія алюзіі на гэта.

УЛАДЗІМЕР ДУБОЎКА

І пурпуровых ветразей узьвівы

(„Узвышша“ № 2, 1929 г.)

Паэма

Ідзі часінай добраю у людзі
ты — вынік дум і творчага гарэньня.
Адзін усьцешыцца, другі асудзіць,
і той і той з цікавасьцю сустрэне.

Табе ня даў я рыфмы мілагучнай, —
ідзі, мой твор, сунегай апавіты.
Цябе бяз рыфмы думка добра лучыць,
шукаючы для духу акавіты.

Клапоцяцца на сьвеце больш аб шлунку,
яго капрызы — дыктатура проста.
І стравы differentнастайнага гатунку
мы на спатканьне маем і на ростань.

А дух трымаем на галоднай норме,
а дух скарынкай эпігоннай сыты.
Яго суседзі, мабыць, не накормяць,
затым патрэбна духу акавіта.

Ня знойдзе містыкі у гэтым крытык,
хоць дзе-які і будзе клапаціцца.
Калі чамусьці выйсьце і закрыта, —
шукае выйсьця творчая крыніца.

Будзі шуканьні новага у стылі,
пакліч на спрэчкі думнае грамадзтва,
каб на здабытках даўніх не застылі,
каб не засьцюжылі у іх мастацтва.

Занадта ціха стала на Парнасе
у сэнсе творчасьці і дасягненьняў.
Сядзяць у эпігоннай апранасе
прадстаўнікі абудвых пакаленьняў.

Пакуль дайшлі — прытупаліся крышку,
няхай у добры час адпачываюць!
Ня трэба нам спыняцца у зацішку,
бо ў далі думка нас вядзе жывая.

Мае сябры, супольнікі у працы,
штурмуйце будучыны аванпосты!
Мы звыклі перашкодаў не баяцца —
яны спрыяюць нашаму узросту.

У час нялёгкі вышлі мы ў дарогу,
когорту нашу ксьцілі навальніцы.
Байкушы розныя ўздымалі скогат, —
імкнуліся прымусіць нас спыніцца.

А мы ішлі з імпэтам віратлівым,
а мы ішлі няспынна і упарта.
І пурпуровых ветразей узьвівы
трымалі курс на сонечнае заўтра.

З нас кожны рэволюцыяй праняты,
кладзём шляхі да новых дасягненьняў,
Узвышшы высім з пролетарыятам
зьдзяйсьняючы квяцістыя імкненьні.

. . . .

Ідзі часінай добраю у людзі
ты, вынік дум і творчага гарэньня.
Магчыма, хто цябе там і асудзіць,
ці вывіх адшукае ў лятуценьнях...

Ад вывіхаў цябе я застрахую
замовай добрай, можа дапаможа...
У інтродукцыі замову надрукую,
каб бесьпячней было у падарожжы. —

Замова ад сустаўных зьвіхаў і ад нясустаўных вывіхаў (каб памагла напэўна — трэба прачытаць адным духам).

На моры, на лука-моры,
на моры, на акіяне
ёсьць выспа, на выспе горы,
на горах вялікі камень.

Каралі на бераг прыносілі хвалі,
ў каралі і зьвіхі і гора хавалі,

каб гора ляжала,
пятрэла на скалах,
у сьвет не хадзіла,
ляжала-б высока,
сохла.

На высьпе стаіць сьвятліца,
ў сьвятліцы жыве дзявіца.
Хадзіла яна ў дубровы
ірвацї травы шаўковай.

На зьвіх прыкладала, памогі давала,
каб зьвіх адкаснуўся на стромкія скалы,

каб гора ляжала,
пятрэла на скалах,
у сьвет не хадзіла,
людзей не звадзіла,

ляжала-б высока,
сохла.

Скаціўся той зьвіх на камень,
няхай ён адтуль ня ўстане,
няхай ён далёка едзе,
няхай ён загразьне недзе.

Як вёз яго жук па калінавым месьце,
той мост праламіўся, пад мост ягамосьці.

І жук утапіўся,
і зьвіх той заліўся,
у сьвет больш ня пойдзе
ні ў якай прыгодзе,
ляжыць дзесь глыбока,
мокне.

Травіцаю зьвіх каралі
ўвагналі яго ў каралі.
На месца суставы сталі
а зьвіх пакаціўся ў хвалі.

Каралі на бераг прыносілі хвалі,
ў каралі і зьвіхі і гора хавалі,

каб гора ляжала,
пятрэла на скалах,
у сьвет не хадзіла,
людзей не звадзіла,
ляжала-б высока,
сохла.

. . . .

Цяпер ніякіх вывіхаў да скону.
Замоўкні, аўтар, хай ідуць гэроі.

. . . .

Лілёвая ссуваецца заслона,
на сцэне нашых дзён гавораць двое. —

Лірык

У нашы дні і радасьці і гора,
у нашы дні руін і будаўніцтва
часінай хочацца мне адпачынку
для сэрца струджанага і для нэрваў.

На думку прыдзе: кінуць хоць на тыдзень
і гарады і ўвесь штодзённы клопат,
узяць, пайсьці вандроўным бесхацінцам
па тых шляхох і крыжавых дарогах.

Паслухаць гоманы людзкога мора,
разгневанага мора-акіяну...
Пазнаць тугу бяскрайную ў дарозе,
пабачыць шчасьце без парфумы хцівай...

У нашы дні...

Матэматык

Дзівак ты ці рамантык,
мой дружа любы, гэта вельмі ясна.
У нашы дні руін і будаўніцтва
ты руйнаваць і будаваць павінен,
а не бадзяцца нейкім дзеньдзівірам.

Лірык

У нашы дні і радасьці і гора
патрэбны дойліды, не дзеньдзівіры.
Аднолькава іх права на паветра
ды і на сонца такжа...

Матэматык

Ты разводзіш
крамолу нейкую і два ухілы!
Змагацца трэба з вамі... Ты ня чуеш?!
Чаго глядзіш так пільна ты на Захад?
Ці сонца вокам думаеш спыніць?
Яно з-за лесу водблескам крывавым
варожыць новы дзень, дзівосны дзень,
такі-ж трывожны для цябе, як сёньня.

Лірык

Угледзься, браце мой, у сьлед яго,
навокал глянь... Што дзеецца навокал!
Здаецца мне — над лесам праплываюць
у край нязнаны ціха караблі.
І пурпуровых ветразей узьвівы
то дух тужлівы ўкрыжаваны мой,
тужлівы дух і жальба...

Матэматык

Годзе, годзе!
Жані тугу на шчырыя бары,
а калі ў ветразі ўвайшла — дык добра:
ня вернуцца ніколі караблі.
Ды гэта лірыка мне не да смаку:
у нашы дні руін і будаўніцтва,
і дыктатуры пралетарыяту
патрэбны нам паэты змагары, —
не ліквідатары, не смутнагляды.

Лірык

...Я запалю агнём свае імкненьні,
я запалю жаданьні і надзеі,

і пурпуровых ветразей узьвівы
мяне над краем любым пранясуць.
Натхняючы прыдушаных пакутай,
бальзам на вусны смаглыя паклаўшы,
ад твараў струджаных тугу і смутак
я аджану і на палёх рассыплю,
пра радасьць новыя навею песьні,
а сам...

Матэматык

А сам?

Лірык

...з тугою і загіну,
бо мне прыемна з ёй, хоць дзіка-страшна...
І караблі праходзяць па-над лесам,
каб зноў вярнуцца заўтра раніцою,
каб зноў пабачыў я цяжар дзівосны
і пурпуровых ветразей узьвівы...

Матэматык

Дзівосна так... І ты дзівак, мой браце!
Якое ліха дзеецца з табою?
У сэрцы у тваім і непакою
і панікёрства нейкага занадта...
Ты адыходзіш ад жыцьця, змаганьня,
ты хутка станеш ворагам працоўных
і дыктатуры пролетарыяту.
Ты — шкодны тып! Наколькі я кахаю —
цябе натолькі скора зьненавіджу!

Лірык

У кожным сэрцы рознае бывае,
бывае дрэннае у ім таксама.
Заўжды шукаем хібы мы ў суседзяў.
А як паглянем на свае учынкі,
а як прагледзім зробленае намі,
дык і ня вельмі радасьці багата...
Затым мяне і ня трывожаць дужа
твае упікі і твае асуды.
Народ наш ведае даўно пра гэта
і свайго сына ён не занядбае.
Вось ты паслухай толькі, што гавораць
дзяды сівыя пра вянец прыроды.

Народнае апавяданьне пра тое, як Бог тварыў людзіну і як чорт сапсаваў усю гэтую работу

Бог, калі тварыў Палесьсе,
з гліны выляпіў людзіну
і на сонейку павесіў,
каб ямчэй падсохла гліна.

Не пасьпеў ён адысьціся,
адпачыць, ці што якое,
як аднекуль чорт-нячысьцік
тут зьявіўся ў непакоі.

Абышоў навокал твору
і памацаў і панюхаў:
не сьмяецца, не гаворыць,
не шманае цаца вухам.

Форма голая пятрэе,
як мастацтва для мастацтва.
—Бог, ня йначай, тут дурэе—
трэба з крытыкай узяцца.

— Сапраўды, ядрона шышкі,
а дзе зьмест у форме гэтай?
Хіба мала мае жыжкі
наша любая плянэта?!

— Мне ня трэба—хай нікому
гэта цаца ня прыдасца! —
Напляваў і так старому
апаскудзіў тую працу.

Ён пасьля пашоў у пекла,
гонорар зьдзіраць за ўчынак.
Бог тым часам меўшы пекны
і прыемны адпачынак

з лесу сунецца памалу,
напявае „Баядэрку".
Каму што, а Богу хвала,
на яе-ж ня зробяць мерку...

Бачыць — чорт хвастом накрыўся
і падаўся у балота.
— От, сварыся, не сварыся —
не адвучыш шкодзіць чорта.

— Пэўна нешта зблоціў недзе,
вось праклятая байкуша!
Лепш глядзеў-бы, як смоўж едзе,
ці на вербе рваў ігрушы.

Падыходзіць да людзіны. —
— А, каб ты затонаў лепей!
Памясіў-бы, ўража, гліны,
паляпіў-бы, як вось лепяць!

Але дзе ты зловіш чорта:
недзе ў Фрыца жлукціць піва...

Так ня кінуў Бог работы:
пачынае зноў цярпліва.

Хоць вазьмі ляпі нанова:
дрэнь з усіх бакоў абліпла.
Шкода — зроблена аснова
і на сонцы сохне сьціпла.

Ня спыняцца ў полі Богу.
А было перад нядзеляй.
Каб ня думаць вельмі доўга,
каб суседзі ня гудзелі, —

ён узяў свой тонкі выраб
і, перавярнуўшы наніц,
захаваў у людзкай глыбі
тую чортаву ўсю памяць.

Выгляд звонку стаў ня дрэнны,
што-ж ля сэрца—ліха знае...
У жыцьці мы больш дарэмна
сэрца чыстага шукаем...

Матэматык

Ня ведаю, ці больш цябе шкадую,
ці больш сярдзіты на цябе, мой дружа.
Ты ня шукаеш вобразаў рэальных,
даступных і карысных у змаганьні.
Замест таго забраўся ў чартоўшчыну
і выцягаеш барахло старое.
У нашы дні руін і будаўніцтва
поэт на фронце антырэлігійным
павінен быць, а не бадзяцца недзе
па балотах Палескіх і выгарах.

Лірык

Цудоўны скарб у творчасьці народнай
для нас сабраны мудрымі дзядамі.
Яго адкінуць — значыць без пашаны
паставіцца да продкаў працавітых.

Матэматык

Пара адмовіцца табе ад баек,
ад гэтай дробна-буржуазнай твані.
Павінны мы тварыць на грунце новым
сучаснае мастацтва для працоўных.

Лірык

Тварыць зусім нанова, ці узяўшы
што кольвек і ад даўніх дасягненьняў?

Матэматык

Няма памылкі у маім сьцьвярджэньні!
Пра спадчыну культуры буржуазнай
даволі сказана і зразумела.
Але якое маюць дачыненьне
да гэтай спадчыны твае ўсе казкі —
ня ведаю і, больш таго, не разумею...

Лірык

Усё, што створана вяльможным панствам,
што створана культурай буржуазнай
ты дазваляеш карыстаць поэту?
А тое, што тварыў народ пакутны,
тварыў у полі пры цяжкой рабоце,
калі на гэтых творцаў буржуазных
ён ліў свой пот і сваю кроў, народ наш,—
ты адкідаеш словам рызыкоўным?!
Які страшэнны нонсэнс і абраза!

Матэматык

Дарэмна ты пакрыўдзіўся на праўду.
Табе даволі поркацца ў старызьне!
У нашы дні руін і будаўніцтва,
і электрычнасьці, і фізкультуры, —
ты мусіш ведаць гэтыя законы,
няўхільныя, як заўтра і сягоньня.

Лірык

Ты можаш лаяцца усім, чым хочаш,
але майго ня зьменіш прakананьня.
Ня веру я, што панская выгадка
перад сярмяжнай мае перавагу.
Пакуль ня маем мы уласных скарбаў,
павінны выбраць вартае увагі.
Мая увага выбірае тое,
што створана працоўнаю сям'ёю.

Матэматык

З тваёй упартасьці сьмяяцца трэба.
У гэтым бачу вынік шовінізму
і бачу тормаз разьвіцьця культуры.

Лірык

Ты уважаеш, што культура ходзіць
у портках ката слаўнае Комуны

Парыскае, у портках Галіфэ?
Або у марынарцы ходзіць Фрэнча,
другога ката, ката нашых дзён?
Ня веру я у гэткія акрасы:
я ненавіджу іх, змагацца буду!
І у імя змаганьня з рознай тваньню
вось гэтае шляхэтнае культуры
я лепш вазьму акрасы Беларусі...

Матэматык

Пакінем лепш! А то далёка вельмі
закоцімся мы з гутаркаю гэтай!
Ня згодзен я з табой, а ты са мной,
заўсёды супроць буду я...

Лірык

А шкода!
Каб ты ня пырскаў так на нашу творчасьць,
сказаў-бы шмат прыгожага табе.
На стромкую гару цябе узьвёў-бы,
адтуль ты ўбачыў-бы зіхценьне пэрлаў,
праменьне самацьветаў нязьлічоных
і глыбіню народнае душы.
Ты паглядзеў-бы на зіхценьне гэна,
ты, як Тамаш няверны, дакрануўся-б
да гэных скарбаў — так яны рэальны.
Але дарэмна гавару з табою...
Пазнаў ты «двойчы два» і тым здаволен.
Вітаю вас!

Матэматык

Чаго ты расхадзіўся?
Хіба пазбаўлен я правоў звычайных
і выказаць ня волен думкі сьмелай?
Як птушка вольная я узьлятаю
у будучыну крозаю сваёю!
Сядзі з сваім брасьнелым барахлом,
з сваімі скарбамі тых самацьветаў:
ад іх ня горача, ня зімна мне.
Ты разумееш? — Я бяз іх шчасьлівы!
Карысьці з іх ня бачу. Вось як!

Лірык

Вось як?
Хацеў-бы расказаць табе я казку,
але і сам ня ведаю, як лепей...
Бо вельмі добрую згадаў я казку,
яна як раз да гэтага выпадку.

Цікавы

Слухай, Крыкса! Хто парушыў
твой спакой і твае права?
Ці якія, скажам, душы,
ці які прывід крывавы?

Крыкса

Ой, ратуйце, цесна вельмі!
Дайце ўзьлёту і прасторы!

Цікавы

Як язык твой толькі меліць, —
бедны Крыкса! Вось дык гора!

Ты братоў усіх распудзіў
гартаваным скавытаньнем.
На цябе сьмяюцца людзі,
што рабіцьмеш, вось пытаньне!

Зарасьце травой дварышча
і дарога баравая.
Хочаш — плачаш, хочаш — сьвішчаш,
табе й хату даравалі.
— — — — — — — — — —

Няспыняная зявайла
усё скардзіцца, што цесна.
Плюнуў і пайшоў памалу
наш Цікавы з гэных весьніц.

Ліха ведае, — гаворыць, —
сьвет такі шырокі здэцца,
а вось на — няма прасторы
і няма дзе Крыксам дзецца...

Зноў праз лес ідзе Цікавы,
шчэ' лунае немы лямант.
Ці то зьлева, ці то справа
замест гэнай хаты — пляма.

Наш Цікавы к сонцу крочыць,
яшчэ трэ' ісьці ня мала...
Разганяе цемру ночы
казка, граючы ў цымбалы.

Самацьветы ў ночы сьвецяць,
сьцежка выткана праменьнем,
Ён шукае праўды ў сьвеце,
каб увіць у лятуценьні...

Хто шукае — той знаходзіць,
хто пытае — той ня блудзіць, —
так суладжана ў народзе,
навучаюцца так людзі.

І пра гэта ўсё гаворыць
у страёх прыгожых казка.
Хто вясёлы — смуткам дорыць,
хто ў тузе — надорыць ласкай.

У страёх прыгожых казка
ходзіць, грае у цымбалы.
Залатая апаяска
ў апаясцы пэрлы, лалы...

Матэматык

Каго і што ты маеш на увазе
у гэтай казцы? Можа мне адкажаш?
Занадта рызыкоўна ты узяўся
каля мяне са скарбамі сваімі!
Ці не стварыў ты часам сам яе,
пасьля каб спэкульнуць «народнай» назвай?

Лірык

Вазьмі, на ласку, зборнік нашых казак,
сабраны слаўным дзедам Сержпутоўскім,
і ў гэтым зборніку адразу знойдзеш
ты гэту казку, ясную, як зоры.
Каго народ у казцы тэй выводзіць, —
ня ведаю, бадай усіх патроху.
Калі удасца быць мне на Палесьсі, —
я запытаюся і напішу.

Матэматык

Якую цноту ты тут прадстаўляеш!
Знайшоў сабе і абарону нават:
«у Сержпутоўскага чытай!» І Шэйна
за хвост прыцягнеш... Кінь такія жарты!
Яны, напэйна, шкодзіць неяк могуць.

Лірык

І сам ня ўцяміў добра, а гаворыш.
«Яны нам шкодзіць могуць»! Чым-жа шкодзіць?
Якая шкода можа з іх адбыцца?
Узяў ты моду гаварыць насупраць,
як той казаў — «дуду ты як надзьмеш,
яна іграе гэтак»...

Матэматык

На табе!
Ужо дуда якаясь выплывае!
А зараз ракам пойдуць дударцы...
Няма чаго казаць — удаўся лірык!

Лірык

Табе бяда вялікая! Хай ходзяць!
А зрэшты, чым-жа дрэнна, што ў народзе

ёсьць прыказкі на розныя здарэньні?
Вазьмі, дай запытаньне мне на спробу,
і я знайду ў адказ апавяданьне.

Матэматык

Ты хочаш ухіліцца ад адказу,
схаваўшыся за прыказкі і байкі?
Замест таго, каб высьветліць пытаньне,
ты нейкую заводзіш «Віктарыну?!»
Ну што-ж... Падобна гэта на задачу —
плюс-мінус, ігрэк-ікс і ўсё такое...
Магу табе прапанаваць пытаньне:
няхай сабе жыве і «Віктарына»...

Лірык

Калі не «Віктарына», дык «Віктося».
У кожным разе клічнік з запытаньнем.

Матэматык

Скажы ты мне... Пра што-б тут запытацца?
Пра сьмешнае ня варта мабыць сёньня.
Ізноў ты пусьціш нешта з падкавыркай.
Скажы ты лепш пра сьлёзы. Плакаць можна
і сьмяючыся нават...

Лірык

Сьлёзы, сьлёзы...
Ліецца многа вас на сьвеце нашым...
і днём, і ўночы, і у шэрым змроку.
Ліецца з воч і чорных і блакітных...
Вы глыбінёй мінулі акіяны,
вы палкасьцю мінулі сонца-косы,
цяжэй саміх сябе вы незраўнана...
Каб вас зьяднаць калі, сусьвету сьлёзы,
дык на зямлі патоп другі пачаўся-б.
У глыбіні і горкай і празрыстай
вы утапілі-б, сьлёзы, назаўсёды
усіх прахвостаў, зьдзірцаў, ашуканцаў,
накрыўшы іх і горам і нядоляй...
Сваёю палкасьцю, сваёй нялюдскай
вы растапілі-б лёд на канцавосьсях,
лядоўню гэту нашага сусьвету...
Каменныя вы сэрцы растапілі-б
у катаў прошлых, ёсьцьных і наступных
сваёю палкасьцю, сваёй нялюдскай...
Каб вас зьяднаць калі... О, сьлёзы, сьлёзы...

Ліецца многа вас на сьвеце нашым
і днём, і ўночы, і у шэрым змроку.
Сабраць у акіяны вас ня ўдасца,
ня ўдасца змыць усю брыду ад сэрцаў,
якая ў сэрцы пала на Палесьсі...
Дык ты прасіў сказаць табе пра сьлёзы?
Табе пра сьлёзы зараз раскажу я! —

Народнае апавяданьне пра сьлёзы.

У аднэй на сьвеце маці
узяла дачка памёрла.
Сьлёз у маці — ня стрымаці,
сьлёзы буйныя, як пэрлы.

Гора матчына цяжкое,
ня ўтамуецца спагадай.
Не знаходзіць супакою,
пахаваўшы сваю радасьць

Прабавалі ўсьцішыць людзі:
хіба плачам вернеш страту?
Жаль вялікі сьціснье грудзі,
сьціснье сэрца ён, праклятьі...

Нясьціханна плача маці
па сваёй дачцы памерлай.
Сьлёз у маці — ня стрымаці,
сьлёзы буйныя, як пэрлы.

Так было, пакуль аднойчы
сон ня сьніла маці тая.
І у змроку, і у ночы
сны ў павекі прылятаюць.

Нешта думаў, нешта сьніцца, —
застаецца праўды зерне.
Зашуміць крылом Дзяньніца,
да сапраўднасьці нас верне...

Сьніцца сон старой, што быццам
у царкве на „ўсе сьвятыя"
давялося ей маліцца
перад вобразам Марыі.

І маліла і прасіла
маляваныя фігуры,
каб жывым давалі сілы,
а хаўтуршчыкам хаўтуры.

Покуль так складала хвалы,
ноч прасьцерлася над сьветам.
У царкве заначавала
гарацешная кабета.

А паўночы давялося
бачыць розныя дзівосы.
Стала-б кратацца валосьсе,
каб ня скручаныя косы. —

Здань ідзе, за ёй другая,
ня зьлічыць і не агледзіць...
Тут прыблудная, чужая,
тут і блізкія суседзі. —

Вось ідзе адкрыты чэрап,
ён мазгі нясе ў портфэлі.
Свае іклы злосна шчэрыць,
каб яму „асанну" пелі...

Пятушок бачком кульгае
на высокіх на абцасах.
Вельмі подленька сьпявае;
кішкі з-заду, быццам пасак...

У гарсэце з парцаляны,
праз якую каву гонім,
проста з долу адкапаны
з „вуткай" пхнецца штатс-псэўдонім...

Каранастая гарыла
у манішцы прасаванай
на хаду галіла рыла
і фокстроцік танцавала...

Ліха матары! і тота
увіхаецца ля жмуры,
быццам п'яны капя плоту
вычварае шуры-муры.

Едзе на байкушы ляпа,
штось раве у голас немы.
Вецер сьвішча цераз храпы,—
вывучай, лінгвіст, фонэмы!..

Далей п'яная капэля
едзе, смаліць нешта ў гусьлі.
На сабе вязе, аж млее,
іх таркан, надзьмуўшы вусы.

Колькі ўсіх яшчэ было там,
дык дакладна і ня ўспомніш:
зварушылася балота,
выплюнула твань сягоньня.

Гарацешная старая
на'т забылася пра гора:
на пачвар тых пазірае,
каб ня ўрок яе каторы.

Але вось пайшлі і душы
больш знаёмыя, суседзі...
Ня відаць усё дачушкі,
затрымалі, мабыць, недзе...

А тым часам бязупынна
праз царкву шнуруюць душы.
Ўрэшце — вось яна, дзяўчына,
белы кужэль апрануўшы.

Маці стала нярухома.
Вусны сьцяты. Што-ж ня клічуць?

Вочы кволяць стан знаёмы
і знаёмае аблічча.

А дачка, маўляў, нямая
і прыжмураны павекі.
На сьпіне яна трымае
вялічэзны цэбар нейкі.

Маці

За чые грахі цяжкія
ты пакутуеш па сьмерці?
Ці знайшлі іх людзі злыя
ў тваім шчырым, чыстым сэрцы?

А ці-ж я сьлязьмі ня мыла
на зямлі твае сьлядочкі?
Ці-ж я Бога не маліла,
цябе выправіўшы ў прочкі?

Хто, ня маючы сумленьня,
даў табе цяжар вялікі,
аж дрыжаць твае калені...
Як яго, злачынца, клікаць?

Дачка

Гэта, маці мая, маці, —
сьлёзы ўсе твае сабраны.
Іх вартую, як багацьце.
Плач яшчэ... Бывай... Дабранач...
. . . .

Сон як пяруном спаліла,
толькі крыльле завілося.
Па сваёй дачушцы мілай
маці болей не галосіць.

Матэматык

Дык вось табе і сьлёзы! Дружа любы!
Каб ты узяў другую форму толькі —
пацалаваў-бы я цябе за тэму...
Якая думка, ах, якая думка!
І як-жа сапсавана чартоўшчынай!
Вазьмі, прыдумай ты для гэтай думкі
сучасную і блізкую нам форму...

Лірык

Прыдумаю, як буду мець магчымасьць.
Цяпер мне сумна стала, вельмі сумна,
як быццам сам навекі нешта страціў...

Матэматык

Адкінь ты сум, якую маеш страту!
Глядзі, каб некаму, як сьлёзы ў сьне,

твой сум ня стаў прызначанай пакутай.
Падумай толькі добра... Ты ня чуеш?
Чаго глядзіш так пільна ты на Захад?
Ці сонца вокам думаеш спыніць?
Яно з-за лесу водблескам крывавым
варожыць новы дзень, дзівосны дзень,
такі-ж трывожны для цябе, як сёньня.

Лірык

Угледзься, браце мой, у сьлед яго,
навокал глянь... Што дзеецца навокал!..
Здаецца мне — над лесам праплываюць
у край нязнаны ціха караблі.
І пурпуровых ветразей узьвівы —
то дух тужлівы ўкрыжаваны мой,
тужлівы дух і жальба...

Матэматык

Годзе, годзе!
Жані тугу на шчырыя бары,
а калі ў ветразі ўвайшла — дык добра:
ня вернуцца ніколі караблі.
Бяры ты прыклад з аўтара, з Дубоўкі,
паслухай, што казаў ён перад намі:
які запал, які настрой бадзёры.
Адкуль ты толькі смутак свой зьбіраеш?

Лірык

Я слухаў аўтараву ўсю прадмову:
з табою разам вышлі мы на сцэну.
Прадмовай гэтай аўтар даў настрой мне.
Чаго-ж яшчэ ты хочаш?

Матэматык

Ты жартуеш?!
Узяў ты, кажаш, свой настрой з прадмовы?
Ну, гэта сьвінства, так хлусіць нахальна!

Лірык

Давай да аўтара мы пойдзем лепш
і спрэчку нашу вырашым супольна.

Матэматык

А пурпуровых ветразей узьвівы
ці прынясуць нас да яго ізноў?
. . . .

Дубоўка

Пашлі шукаць мяне мае гэроі...
Хіба пра іх я дрэнна клапаціўся? —
Зладжыў для іх ад вывіхаў замову,
за ўзор народную замову ўзяўшы...
Яны адзін другога вінавацяць,
прычыны нейкія зьявіліся адразу...
І кожны з іх сябе праўдзівым лічыць
у гэтай спрэчцы, можа і цікавай!
Чакаць? Мірыць? Ня буду лепш займацца,
а то мае уласныя гэроі
мяне самога ў нечым зьвінавацяць.
Няхай ідуць да чытачоў гаворацць,
супольна з імі вырашаюць крыўды...
Няхай нясе іх творчае гарэньне
і пурпуровых ветразей узьвівы...

31.I.1929 г.
Масква.

АНТ. НАВІНА

Да крыніцаў творчасьці М. Багдановіча

Як згодна сцьвярджаюць усе біографы Максіма Багдановіча (— дый пацьвярджаў гэта неаднакротна сам наш паэт), галоўнай крыніцай тэматыкі ягонае паэзіі было тое знаёмства з беларускай народнай паэзіяй, якое ён атрымаў дзякуючы свайму бацьку, Адаму Багдановічу, даволі ведамаму працаўніку на ніве этнаграфіі — пачаткова беларускае, а пад канец жыцьця — расейскае. Знаёміўся Максім з беларускай этнаграфіяй у першую чаргу шляхам вусных пераказаў бацькі; але ня можа быць ніякага сумлеву, што — ў меру вырастаньня й выкарыстываньня кніжных матар'ялаў у бацькавай бібліотэцы — мусіў Максім часта заглядаць і да першае друкаванае працы Адама Багдановіча з галіны этнаграфіі, паймена — кніжачкі пад загалоўкам »Пережитки древняго міросозерцанія у бѣлоруссовъ. Этнографическій очеркъ А. Е. Богдановича. — Гродна, 1895.»

Каб пераканацца, што-ж пачарпнуў Максім Багдановіч з бацькавае працы, трэба было беспасярэдна з ёю пазнаёміцца. Але кніжачка гэтая — цяпер ужо вельмі рэдкая, і аўтару гэтых радкоў толькі зусім нядаўна ўдалося яе дастаць і прачытаць*). І вось, пры чытаньні яе і пры параўнаньні з ёй Максімавых вершаў, выявіўся запраўды-ж вялікі ўплыў яе на тэматыку вершаў песьняра.

Трэба тут зрабіць адну засьцярогу: Максім Багдановіч, пэўне-ж, не абмежываўся аднэй гэтай кніжыцай, знаёмячыся з беларускай народнай паэзіяй і этнаграфіяй. Яму былі ведамы ўсе зборнікі этнаграфічных матар'ялаў (Раманава, Шэйна і інш.). Але бацькава праца была першай кніжкай з гэтае галіны, і ў ёй аўтар стараўся даць некаторую сынтэзу на падставе таго, што ў іншых працах падаецца, як сыры матар'ял. Дый, як першая, бацькава кніжка мусіла зрабіць на Максіма Багдановіча найглыбейшае ўражаньне.

Гэта з яе Максім Багдановіч знаёміўся з беларускай народнай міфалёгіяй, і ягоны Лясун, Вадзянік, Падвей, ягоныя русалкі, ягоны Зьмяіны Цар — усе яны надзелены рысамі, якія бацька паэта знайшоў у народных вераваньнях, казках, апавяданьнях.

Возьмем хоць-бы *Лясуна,* якому Максім Багдановіч пасьвяціў ажно тры вершыкі.

Над лясамі — кажа Адам Багдановіч у сваёй кніжцы — гаспадаруе Лясун. Ён узростам роўны дрэвам таго лесу, у якім жыве. Ён страшэнна дужы, — вырывае сосны з кара-

*) Кніжачку набыў Беларускі Музэй Ім. Ів. Луцкевіча ў Вільні.

нямі. Ён «іржыць» — рагоча, калі весел; вые, як воўк, калі сумуе; рычыць, як мядзьведзь, калі злы. Можа вельмі напужаць чалавека дый ваўкамі зацкаваць.

І Максімаў Лясун — такі-ж вялічэзны: ён можа іграць на соснах, быццам на струнах:

...Пад рукамі яго, разважаючы сум,
Быццам тысячы крэпка нацягнутых струн,
Тонкаствольныя сосны зьвіняць...

І Максімаў Лясун любіць ліхія жарты над людзьмі, каторыя пападаюць у нетру лясную. Пачуўшы звон падкоў у лесе, Максімаў Лясун кажа:

Ці ня гукнуць, каб рэха па лесе пайшло,
Каб з касьцямі ў навалкі разьбітымі
Нехта біўся ў крыві, каб мне можна было
Усю ноч рагатаць пад ракітамі?!

А вось і *Вадзянік*. Вадзянік — апісывае бацька — жыве ў »жывой« вадзе, у крыніцах бяздонных, у глыбіні рэк і вазёр, — наагул у такіх месцах, дзе вада ўзімку не замярзае: гэта, кажа народ, лёд таець ад дыханьня вадзяніка.

Сын піша аб Вадзяніку:

Сівавусы, згорблены, я залёг між цінай
І гадамі грэюся-сплю на дне ракі.
Твар травой аблутаны, быццам павучынай,
Засыпаюць грудзі мне жоўтыя пяскі...

І характэрна, што бацькавае апісаньне мала паўнейшае, чым Максімавае...

Аб *русалках* Адам Багдановіч кажа, што яны здаюцца Беларусу харошымі дзяўчынамі з распушчанымі даўгіміваласамі. Гэтым абмежываецца ўсё апісаньне іх выгляду. Вось-жа і Максім Багдановіч гэту характэрную рысу асабліва вобразна выдзяляе. Даючы абраз возера ўначы, з якога месяц „цягне срэбныя сеці,“ наш паэт дадае:

У іх русалкі заблуталі косы...

Але найбольш красамоўна пацьвярджае справядлівасьць нашае тэзы аб уплыве на тэматыку й апісаньні Максімавы кніжачкі ягонага бацькі прыраўнаньне апісаньня *„зьмяінага выраю“* этнографам і паэтам. Адам Багдановіч піша:

»Над усімі гадамі ёсьць цар. Пад ягоным асабістым правадырствам ідуць зьмеі на зімовы сон. Цар-зьмей ідзе наперадзе, а за ім — безьліч ягоных поўзаючых падданых. Ён увелькі большы за ўсіх, ягоная луска адлівае серабром і золатам, на галаве ў яго карона з маленькіх залатых ражкоў. Трудна спаткаць зьмеяў падчас гэткае іхняе вандроўкі, бо яны выбіраюць недаступныя чалавеку месцы. А калі ўдасца спаткаць зьмяіны »вырай«, разаслаць перад царом настольнік, палажыць хлеб-соль ды пакланіцца яму да зямлі, дык ён, перапаў-

заючы праз настольнік, у аддзяку скіне з галавы адзін залаты ражок...”

А вось як гэтае апісаньне — чуць-што не дaслоўна—адбілася ў намаляваным паэтам мастацкім абразе (верш «Зьмяіны цар»):

...Мы ўжо выйшлі з цесных, душных
Падзямельных норак,
На зімовы, цёплы вырай
Цягнемся-паўзём.

У полі, ў лесе нам усюды
Пралеглі дарожкі!
Уступкай рушымся між пушчы,
Насамперад — я.
Зіхацяць маей кароны
Залатыя рожкі,
Цёмным блескам адлівае
Уся луска мая.

Нам ня трэба ні ад чога
Ноччу абароны, —
А спаткаем чалавека,
Порт рассьцеле ён:
Залаты ражок яму
Я ўраню з кароны,
І праз белу палатніну
Дальш мы папаўзём.

Ня будзем тут падаваць далейшых прыкладаў уплыву працы Адама Багдановіча на паэзію ягонага сына (прыкладам: варажбіцтва млынароў, заклінаньні і г. д.). Абраз і так даволі ясны. Зьвернем толькі ўвагу на адзін верш Максіма Багдановіча, на якім адбіўся ўжо не бацькавы этнаграфізм, але — пагляд на беларускі народ і ягоны культурны ровень.

З лёгкае рукі савецкіх літаратурных крытыкаў прынята азначаць паэзію нашаніўскае пары, як нейкае агульнае стагнаньне, ныцьцё, »пусканьне сьлязы« і г. д. Пагляд гэты — з грунту фальшывы: калі й бачым у гэным часе *паадзінокія* вершы ў таго або іншага аўтара, каторыя ліюць сьлёзы над нядоляй народнай ды памагаюць народу стагнаць, дык *агульны* тон гэтае паэзіі быў прасякнены імкненьнем да вызваленьня, клічамі да волі й барацьбы за яе. Вось чаму, калі ў 1913 годзе выйшаў у сьвет „Вянок“ Максіма Багдановіча, адзін з вершаў зборнічку—„Краю мой родны, як выкляты Богам“... — на агульным фоне нашаніўскае паэзіі, поўнае веры ў свае сілы і ў сьветлую будучыню народу, прадстаўляўся беларускаму грамадзянству нейкай аномаліяй, выклікаў глыбокае недаўменьне. Шмат хто напісаньне верша тлумачыў тым, што паэт, жывучы далёка ад роднага краю (— у Яраслаўлі), ня бачыў уласнымі вачыма народнага жыцьця, не адчуваў, як б‘юцца сэрцы мужыцкія, захопленыя вялікай ідэяй адраджэньня

й волі. І ў гэтым была вялікая доля праўды. Але — ня ўся праўда. Усю праўду пазнаем, калі прачытаем уступнае слова Адама Багдановіча да памянёнае ўжо кніжачкі яго.

Адам Багдановіч, як блізу й усе сучасныя яму беларускія інтэлігенты, што павыходзілі з народнае гушчы, быў увесь пад уплывам фальшывага ў сваей істоце перакананьня аб „камплексе ніжэйшасьці" Беларусаў. Пераходзячы з вёскі да места, знаёмячыся — перад усім праз школу — з расейскай літаратурай і культурай наагул, Адам Багдановіч, як і шмат хто іншы, раўнаваў культуру беларускага *сялянства* з культурай расейскае *ітэлігенцыі*. Гэта было раўнаваньне рэчаў зусім нясумерных. Калі-б раўнаваць культуру тагачаснае беларускае вёскі з культурай вёскі-ж расейскае, дык для пэсымізму, для пачуцьця «ніжэйшасьці» Беларусаў месца ня было-б: наадварот, такое прыраўнаньне выявіла-б мо' нават вышэйшасьць Беларусаў над народнымі гушчамі »пануючае нацыі«. Але, стануўшы на няправільным становішчы, Адам Багдановіч няўхільна мусіў зрабіць тыя вывады аб Беларусах і іх „някультурнасьці", якія апублікаваў у ўступе да вышэй памянёнай сваей кніжачкі.

»Беларускія сяляне, тлумачучы пасвойму выражэньне „западный край", — выражэньне чужое для беларускага языка, — перакладаюць яго словамі «западлы край», г. зн. закінены, заняпалы. Хаця з філёлёгічнага гледзішча шмат можна сказаць супроць гэткага вольнага перакладу, аднак запраўднасьць апраўдывае яго. І жыцьцё Беларуса, і ягонаая творчая дзеяльнасьць рэзка адзначаны кляймом неразьвітасьці, адсталасьці, забітасьці. Так яно й ёсьць: »западлы« край, „западлы" народ..."

Гэтак пачынае свой уступ Адам Багдановіч і далей стараецца даказаць справядлівасьць свайго пагляду, кажучы аб беднасьці беларускае народнае паэзіі, народнае песьні, аб »дзікасьці« абычаяў беларускіх, аб »грубым фэтышызьме« сьветапагляду Беларуса — »з гледзішча цывілізаванага чалавека«. Адам Багдановіч, хоць з філёлёгіяй ніколі ня меў шмат супольнага, бярэцца судзіць і язык Беларусаў з „філёлёгічнага" гледзішча. Язык гэты, быццам, »бедны на словы«. »Некаторая частка іх запазычана з польскага языка, а за апошнія часы, сярод маладога пакаленьня, даволі шырака пачынаюць ужывацца словы расейскія». »Беларускі язык бяднейшы азначэньнямі адарваных паняцьцяў, чым вялікарускі народны язык, і ў гэтым адстае нават ад маларускага. Ён такжа ня мае гібкасьці, сілы й выразьлівасьці першага ды мяккасьці, мілагучнасьці другога.«

Адам Багдановіч паўтарыў тут усе тыя недарэчнасьці, якімі маскоўскія „культуртрэгеры" набівалі галовы беларускіх вясковых дзяцей у расейскіх школах—ніжэйшых і сярэдніх,— зусім так сама, як гэта цяпер робіцца многімі Палякамі... Але,

паўтараючы іх бяскрытычна, ён стараецца знайсьці прычыну ўсіх гэтых зьявішчаў. На ягоны пагляд, прычына гэтая — страшэнна цяжкія абставіны беларускага вясковага жыцьця, бяда, голад, церазмерная праца. Вёска йшчэ перажывае жудасную спадчыну прыгонных часоў. »Толькі сваей працавітасьцяй Беларус не адстае ані ад Вялікаруса, ані ад Маларуса, а вынасьлівасьць ягоная большая, чым у таго й другога. Але гэтага, ведама, мала, і справядлівасьць вымагае паставіць Беларуса — паводле тыпу духовага разьвіцьця — ніжэй за ягоных братоў з вялікае рускае сям'і... —«Паўтараем: толькі бязкрытычнасьць у адносінах да прапаганды «камплексу ніжэйшасьці» Беларуса ў расейскіх школах, толькі вельмі слабое знаёмства і з беларускай народнай паэзіяй, і з беларускім языком, і з культурным роўнем сялянства »пануючае нацыі« у гэтага сьвежага адэпта расейскае культуры маглі падыктаваць Адаму Багдановічу падобныя словы. І сягоньня — праз 44 гады пасьля напісаньня гэтых слоў, калі магутны адраджэнскі рух зразу падняў „западлы“ беларускі народ на вышыню культурных народаў сьвету, — словы гэтыя пакажуцца нам сьмешным анахранізмам. Але ў вачох Максіма Багдановіча, каторы кожнае слова свайго бацькі прыймаў на веру, дадзены апошнім фантастычны абраз адсталасьці Беларусаў мусіў прадстаўляцца зусім рэальным, згодным з праўдай. Культурны заняпад і адвечны цяжкі труд у голадзе й паняверцы — вось тое, што Максім Багдановіч прыняў на веру з бацькавае кніжкі, як асноўныя рысы жыцьця беларускага народу. І гэтыя рысы паэт адбіў у сваім вершы *„Краю мой родны“*. І гэтыя рысы выклікалі ў яго пачуцьцё роспачы, сумлеву ў перамозе беларускае адраджэнскае ідэі:

Брацьця! Ці зможам грамадзкае гора?
Брацьця! Ці хваце нам сілы?

Сілы хапіла. І на вачох Максіма Багдановіча, каторы сам хутка здолеў вызваліцца ад накіненага яму бацькам «камплексу ніжэйшасьці» ды самастойна выкрыў вялікую красу й багацьце беларускае народнае творчасьці, — беларускі народ, культурны стан каторага Адам Багдановіч раўнаваў з станам з часоў летапісца Несьцера, — сваей творчай працай даказаў сваю жыцьцёвую здольнасьць і права на месца пад сонцам!

Вільня, травень 1939.

М. Ларчанка і Л. Фіглоўская

Новыя матарыялы аб беларускай літаратуры XIX стагодзьдзя*)

Інстытут літаратуры і мовы Акадэміі навук БССР, працуючы над стварэньнем падручніка па беларускай літаратуры, паслаў аўтараў гэтых радкоў у навуковую камандыроўку ў Ленінград з мэтаю адшуканьня новых матарыялаў па беларускай літаратуры XIX стагодзьдзя.

У ленінградзкіх архівах і бібліятэках мы змаглі выявіць некаторыя невядомыя арыгінальныя матарыялы па беларускай літаратуры, якія маюць для нас навуковае й палітычнае значэньне. Разам з тым знойдзен цэлы рад поўвядомых старынных твораў, аб якіх у Беларусі мала хто ведаў, хоць яны й былі надрукаваны.

Сярод знойдзеных матарыялаў асаблівую цікавасьць прадстаўляюць арыгінальныя, яшчэ нідзе не надрукаваныя рукапісы мастацкіх твораў на беларускай мове: 1) «Панская ласка»—ананімная паэма аб прыгоньніцкім ладзе, у якой даецца рэзкая крытыка паноў-прыгоньнікаў; 2) Воскресение Христово и сошествие его в ад» — ананімны пародыйны твор, які нагадвае сабою беларускую паэму «Тарас на Парнасе»; 3. «Сьцяпан і Тацяна» — бытавая паэма аб жыцьці беларускага сялянства, напісаная селянінам Марозам. Гэта паэма надрукакавана была ў газэце «Минский листок» за подпісам Шункевіча... Як цяпер відаць з рукапісу, гэту паэму напісаў ня Шункевіч, а селянін Менскай губэрні. Наступны рукапісны твор — п'еса «Адвячорак», напісаная Сазановічам, паказвае быт прыгоннага сялянства.

Апрача гэтых арыгінальных рукапісных твораў, яшчэ нідзе недрукаваных, намі знойдзен рад ананімных «гутарак» рэвалюцыйна-дэмакратычнага характару: «Дзядзька Антон або гутарка аб усім чыста, што баліць, а чаму баліць не ведам»; «Гутарка Данілы са Сьцяпанам»; «Гутарка Паўлюка»; «Хто праўдзівы прыяцель беднага народа»; «Гутарка аб тым, куды мужыцкія грошы ідуць»; «Як зрабіць, каб людзям стала добра на сьвеце»; «Гутарка Кузьмы з Апанасам» і інш. Некаторыя з «гутарак» друкаваліся толькі ў Лёндане й Парыжы.

Усе гэтыя «гутаркі» ўяўляюць сваеасаблівы літаратурны жанр *мастацкай публіцыстыкі.* У іх арганічна спалучаны эле-

Пад гэткім загалоўкам кандыдаты філёлёгічных навук М. Ларчанка і Л. Фіглоўская ў часапісе „Літаратура і Мастацтва", № 13 (427), Менск, 9.III.39 — надрукавалі цікавы інфармацыйны артыкул. Перадрукоўваем амаль увесь гэты артыкул выкідаючы з яго радкі агітацыйна-палітычныя. — Рэд.

мэнты мастацкасьці з публіцыстычнай прапагандай палітычных, рэвалюцыйных ідэй, накіраваных супроць самаўладзтва, як асноўнага социяльнага зла. Мова гэтых «гутарак» зьяўляецца народнай беларускай мовай; яна калярытная й сакавітая. Сам жанр «гутарак» у гісторыі беларускай літаратуры XIX стагодзьдзя займае досыць вялікае месца і патрабуе свайго дасьледаваньня і вывучэньня.

З друкаваных матарыялаў на беларускай мове знойдзены такія рэдкія творы, як зборнік «Расказы на беларускім нарэччы», сярод якіх асаблівую цікавасьць прадстаўляюць: «Казка ня казка, быль ня быль, але так бывае», «Вялікая памылка нашых беларусоў». Таксама знойдзены гістарычныя і міфалагічныя песьні: «Быў на Русі чорны бог», «З-за Слуцка, з-за Клецка», «А калі-б калі маскалі прышлі», якія надрукаваны ў зборніку 1839 г...

У Ленінградзкім архіве Унутранай палітыкі, культуры і быту СССР знойдзены: справа Дуніна-Марцінкевіча аб выданьні п'есы «Пінская шляхта», забароненай цэнзурным камітэтам міністэрства ўнутраных спраў, таму, што там высьмейваліся чыноўнікі; справа Багушэвіча, у якой цэнзурны камітэт спасылаецца на невядомы нам зборнік Багушэвіча „Беларускія расказы М. Бурачка", — гэты зборнік, як відаць з адносіны цэнзурнага камітэту, забаронены таму, што ў ім былі творы, накіраваныя супроць царскага ўраду. Тут-жа знойдзена справа цэнзурнага камітэту аб забароне друкаваць рукапіс на беларускай мове «Беларуская ластаўка», напісаная студэнтам Паленкоўскім. Характэрнымі зьяўляюцца таксама справы цэнзурнага камітэту адносна твораў Блуса і Аляксандра Ельскага. Творы гэтых пісьменьнікаў цэнзурным камітэтам былі дазволены да друку.

Значную цікавасьць прадстаўляюць знойдзеныя новыя вершы Багушэвіча і Янкі Лучыны. У надрукаваным на папяроснай паперы зборніку «Песьні», у якім зьмешчаны вядомыя творы Багушэвіча, ёсьць тры вершы, якія да гэтага часу ня былі нам вядомы... Да гэтага часу ня былі вядомыя такія творы Янкі Лучыны, як „Па поваду стогадовай гадавіны з дня нараджэньня лёрда Байрана", „Не ради славы иль расчета", „Вясна", „У памяць бенефіса" і „Роднай старонцы", якія не ўвайшлі ў яго зборнік „Вязанка".

Апрача гэтых літаратурных матарыялаў, намі знойдзены некаторыя матарыялы фальклёрнага характару. Сярод іх першае месца займаюць рукапісы нідзе недрукаваных беларускіх казак, легенд поўбылІннага характару і песень. Некаторыя з іх мы перапісалі. Значную цікавасьць прадстаўляе легенда „Пра мужыка Ерафея, яго жонку і сына Фаму", якая нагадвае аповесьць старой рускай літаратуры „О горе-злосчастье". Легенда „Пчолы", поўбыліны „Асілкі" і „Чортаў мост" зьяўляюцца надзвычай цікавымі і характэрнымі творамі беларус-

кага эпасу. Таксама знойдзены дзьве песьні, якія нідзе яшчэ ня былі надрукаваны, але маюць пэўнае дачыненьне да творчасьці Ф. Багушэвіча і Я. Купалы.

Сярод друкаваных, але мала вядомых матарыялаў намі выяўлена значная колькасьць помнікаў беларускага гераічнага эпасу. Частку гэтых твораў мы перапісалі для выданьня асобнага зборніка альбо хрэстаматыі па фольклёру. Вельмі цікавымі зьяўляюцца такія творы беларускага гераічнага багатырскага эпасу, як „Кара ў сто лет", „Кацігарошак", „Сем сыноў і сястра", „Нязнайка", „Адзенюк", „Хлопец і дзяўчынка", „Разваліґара, Развалімуры, Зламіжалеза", „Смок", „Аб цыгану, які зьмея ашукаў", „Аб жалезным ваўку", „Аб чалавеку з жалезным носам", „Аб цыгану, як ён забіў зьмея", „Аб зьмеях страшэнных", „Праз Ілюшку", „Аб Когцю" і інш. Усе гэтыя творы належаць да багатырскага эпасу, які шырока разьвіваўся ў вуснай творчасьці беларускага народу даўнейшых часоў.

Звычайна ў пералічаных творах беларускага эпасу даюцца вобразы зьмея альбо злога чалавека, увасабляючых сабою ворагаў народу, і вобраз багатыра, увасабляючага сабою сілу, мужнасьць, дабрату, гераізм, выносьлівасьць і іншыя высокія якасьці народу. Гэты вобраз багатыра ў названых творах зьяўляецца вельмі цікавым і высокамастацкім. Тут народ увасобіў сваю барацьбу з ворагамі, якія доўгі час прыгняталі працоўных. У гэтых творах багатыр заўсёды вядзе барацьбу з рознымі несправядлівасьцямі і парокамі соцыяльнага жыцьця. Ён вытрымлівае вялікія цяжкасьці ў барацьбе і заўсёды перамагае зьмея, перамагае ворага й зло... Беларускі народ, які... на працягу некалькі вякоў вёў барацьбу супроць ворага, стварыў і адпаведныя творы багатырскага эпасу, у якіх паказаў сваю сілу, свае здольнасьці, сваю непераможнасьць, сваю веру ў сьветлае, шчасьлівае жыцьцё...

І, нарэшце, трэба сказаць некалькі слоў аб творы „Плач белорусской земли". Гэты твор быў надрукаваны ў 1894 годзе. Асобнай адбіткай ён уваходзіў у зборнік „Смесь". Аб гэтым творы ведалі далёка ня ўсе нават спэцыялісты. Аб ім ніколі не гаварылі і ня пісалі, ня гледзячы на тое, што ён надрукаваны асобнай адбіткай.

„Плач белорусской земли" напісаны на рускай мове... зьяўляецца ананімным. Ён патрабуе свайго дасьледаваньня, належных навуковых камэнтарыяў...

Усё зробленае намі за час навуковай камандыроўкі ў Ленінградзе па адшуканьню новых матарыялаў па беларускай літаратуры — толькі пачатак вялікай работы. Нам толькі ў Ленінградзе стала вядома, што ў маскоўскіх архівах таксама ёсьць матарыялы па беларускай літаратуры. У асабістым архіве Срэзнеўскага, які перададзен з Ленінграда ў Маскву, ёсьць беларускія, яшчэ нідзе неапублікаваныя казкі, легенды й быліны...

Гераічны эпас беларускага народу, існаваньне якога да гэтага часу адмаўлялася, мае сваё пэўнае месца ў беларускім фальклёры. За вывучэньне й выданьне ўзораў беларускага багатырскага эпасу патрэбна ўзяцца з усёй сур'ёзнасьцю. Таксама трэба ўзяцца за адшуканьне ў архівах матарыялаў па старажытнай беларускай літаратуры. Над гэтым яшчэ ніхто як сьлед не працаваў.

Я. СТАНКЕВІЧ

Мова крывіцкага (беларускага) рукапісу XVI стаг. „Аль кітаб“

Фонэтычны й морфолёгічны разбор

(Працяг, гл. № 2 (19) „Калосься“ з 1939 г.).

Еры просьле j

1) *На пачатку слова.* Тут маем гэткія прыклады:

a) meŭ 22a2, 22a6, majūc 21b8 22a15 і шмат іншых; гэтае слова заўсёды лучаецца бяз *i-;* прыведзеная хорма паўстала зь *jьm-. kenacime 34a17, ne mecimeš 41b10, činicime 41b11, pecimūc 116b6 — зь *jьmešь, *jьmetь і пад.; pamenonije 47b3, vižmenavanich 77b10 (зь *jьmen-). hranu 63a7. Так сама бяз *i-* ё прыймя-прыстаўка *jьz: ne pejce s kur'anu 3b3, kali z hetich rečej što učinic 43a16, Pic buduc sukravicu, z ceł ludzk'ich cekūčuju 64a12, ne z matk'i cnota dzicaci prichodzic, 'ale z ŭčinkaŭ dubrich (=do—) 66b4-5, spoŭniŭši 74 a6, 'Ani z koha ne naradziŭše i z jeho nichto ne naradziŭše 75b3-4, kažnij z' jich 81a5, kroŭ pojdze z nosa 84a17, chto z vas lepšij 98b2, Ibrahīmu... 'uradziŭše Is'ma'īł z Hagari 99a14, z 'ačej śloz'i išlī 105a15-16, Z'menili 108b7, z čirvonaho 'ekiku (камяня) 109a3, pleči z krištału 110b4, Z dimū stvariŭ... nebo 117b1, Ż' bełaho perła pakoji 123b7, S pad taho dzerava 'adna vada vichodzic 124a8, Z 'adnej małako s tich rek, 'a z drūhoj mod 124a9, ūs'o z darahoha kamena 132a5 і мноства іншых. Таксама ў іншых старакрывіцкіх памятках і ў цяперашняй мове.

b) j ёсьць заўсёды просьле пярэчаньня й прыстаўкаў, што канчаюцца на самагук: ne jdzeš 53b1, ne jdzice 20a4, prijdze 3b16, 4a7, 4b2, prijduc 30a12, perejdze 25b16, vijdzeš 44b17, vijdze 43b5, 52a3, pojdzece 61b8, 'ūvojdze 35b14, zajdze 119a5 і інш.;

prijme 3b11, 28a6, prijmu 48a2, 76b7, 106b7, prijmi 125a9, 125b1, prijmūju 16b4, prijmūje 50a6, prijmūjuc 61a17, prijmūjuči 50a13, vijme 43b4;

perejnačic 138b13.

Так сама ёсьць j па прыстаўках, што канчаліся спачатна на *ъ*, а цяпер перад j на *-у-* (кір. *-ы-*), значыцца па sъ, otъ, што перайшлі ў *з, ад*, і іншых: zijduc 30a9, 126a6, zijdze 55b8, 97a4, zijdu 105b4, ʻadijduc 52a5, ʻadijdzu (зам. ʻadijdu) 96b11, padijmucca 49b16, padijme 84a2, ne zdijmūjce (з устаўным *д*) 107a10. Подле аналёгіі менаваных такжа прыстаўкі vʻъz - а roz - канчаюцца на -у- (кір. *-ы-)*, дзеля таго й просьле іх ё j: ʻuzijdze 87a7, 87a9, 87a10, 87a11, 87b3, 87b17, razijdziceśe 28b6.

Адноўчы лучыла просьле пярэчаньня *і-* ne ʻidzice 69b11.

Па прыстаўках, што канчаюцца на сугук, ё *-і-:* bezimennim (палцам) 73b11.

c) На пачатку слова маюць *і-* гэткія словы: inačej 72a11, inšich 15a3, inšije 20a17, 16b17, imem 19b11, ime 43a5, idzice 28a15, ihraŭ 28b14, ihri 28b11, ihrac 43a14, 43b2, ihrane 63b2 (але такжа hranu 63a7), iskrak 43a5, 43a15, iščuc 136b14.

Некаторым із гэтых словаў адказуюць у цяперашняй мове хормы бяз *і-:* накшы Арляняты Ашм. п., начай ib., граць Карскі, II-1,274, грышча ib. У словаў, утвароных ад *jьmę і нямаючых націску на **jь-*, гэты склад адпаў: мянюшкі Карскі, ib. мянінькік Слоўн. Насовічаў, 283, ты-ж майго меньніка не ўпадабала Дзіс. п. Рам. VIII,199.

2) У нутры слова на месцу -*jь- з *ь* моцным знаходзім -je-: dušejemca Az'rail 125a6 dušajemcam 138b12, tajemnicu 95b2, tajemnuju 105b3. Таксама ў іншых старакрывіцкіх памятках і ў цяперашняй мове.

Крывіцкае *іншы* мае націск на і-, але ў *іначай* (звычайна *начай*) націск на *на̀-*. *Імя* мае націск на *і-* побач із націскам на канцы некаторых мясцовасьцеў. У *іскра* так-жа націск на *і-*. У праславянскім языццэ ўсі менаваныя словы мелі націск на *jь-, прыр. рас. ѝнуда, и́наче, славен. înam, рас. и́мя и́скра, ды адпаведныя сэрбахарвацкія.

З гэтага бачым, што на пачатку слова націсьненае *jь- давала *і-* а ў **jь-* ненацісьненым *ь* чэз, аставалася j, што далей чэзла. *і-* ў *ігра* магло быць перанесена па аналёгіі з ac. sg. і множнага ліку, дзе *jь было пад націскам, прыр. схр. ac. sg. рас. plur. и́*гры*. У *jьd-, хоць ня было націску на *jь- (рас. иду схр. ды аднак маем *і* (*іду*).І. Развадоўскі выясьніў, што *і* *jьdą- паўстала аналёгічна подле неазначанага ладу iti з *і-* спачатным (R. S. VII.12).

Дык развой групы *jь- будзе гэткі:

Еры просьле j, як кажныя іншыя паўсамагукі, рашчапіліся на моцныя й слабыя. Моцныя вакалізаваліся, а слабыя чэзьлі, аставалася, значыцца, адно j, каторае просьле пярэчаньня й прыймёнаў-прыстаўкаў далей аставалася, а бязь іх чэзла.

Але пад націскам слабы *ь* у *jь-узмацняецца і асыміляцай ізь j паўстае *i*-*)

Калі ў вадных склонах было *jь-ненацісьненае (значыцца давала j), а ў іншых націсьненае (дык — *i*), магло з часам наставаць выраўнаньне і ўвагульнялася адна або другая хорма. Rozwadowski, RS. VII, 9, Lehr-Spławiński, R.S.VIII, 152.

У языкох — расейскім, баўгарскім, сэрбахарвацкім і славенскім *i* з прсл. *jь-націсьненага выціснула j з прсл. *jь- у палажэньню бяз націску; у крывіцкім (беларускім), чэскім і асталых языкох славянскіх астаўся стан спачатны, значыцца *i*- зь *jь-націсьненага і j або яго шчэзьненьне зь *jь-ненацісьненага. Відавочна гэты падзел настаў дыялектычна яшчэ ў языцэ праславянскім.

Унутры слова ё падобны разьдзел: расейскі й баўгарскі языкі маюць *-i-*: рас. *достоин, взаимный, яичница, яиц, троицкий* і пад.; асталыя славянскія языкі разам із крывіцкім маюць правільнага заменьніка моцнага *ь* (белар. прыемны, узаемны, яечня, траецкі і пад., схр. dostojan і інш.).

Еры перад j

Тут маем гэткія прыпадкі:

1. Канчатак-*ъjь, -*ьjь nom. sg. masc. o-, io-асноваў складзеных прыметаў, такіх-жа займёнаў, парадкавых лічбаў і дзеяслоўных прыметаў дае -уj, -ij; у (кір. *ы*) па грытаных перайшло ў *i*. Прыклады: hetij 18а6, švetij 18а7, drūhij 25а1, tak'ij 25b1, złij 34а17, darahij 58b15, śomij 25а11, 'ośmij 25а12, vjedomij 16а16, dužij 75b16, kažnahodnij 124b2 і h. d. Аднолькава прыметы ьjо-асноваў: božij 4а3, 29а12, trecij 1а8; а такжа ў займёнаў: čij 126а4, čija 125b4, čijho 37b17, 38а2, 38а3, 38а4, čijej 38а6.

Але заўсёды ё toj 5а13, 105b13, śoj 195b10, s'oj 105а10 замест спадзяванага tyj, śij. Гэта, пашыраныя дыялектычна, аналёгічныя хормы подле *мой* і пад., прыр. схр. taj.

2. а. На месцу *ьjь у канчатку nom. sg. назоўных імёнаў (substantiva) у цяперашняй мове ё -ej. Есьць тут колькі словаў агульных: *верабей, салавей, зьмей* і ладне хрышчоных імёнаў чужога паходжаньня (прыкл. Сяргей). У рукапісе гэтыя словы ня стрэліся, але ё хормы на -ej, -ij як арабізмы, або наватворы ад арабскае асновы. Ад араб. Алі ў беларускім тэксьце ё 'Elej 18а7. Гэтае слова сьведчыла-б, што ў канчатках назоўных імёнаў -ьjь перайшло ў беларускім языццэ ў-ej,

---

*) Што пад націскам паўставала і-, а ня ji-, як выкладае Лер-Сплавінскі, даводзіць наш рукапіс. Як відаць із прыведзеных прыкладаў, перад і зь *jь няма j, тым часам, як ува ўсіх іншых прыпадках (значыцца, дзе і- не на месцу прсл. *jь- перад і, як і перад асталымі самагукамі, маем заўсёды j, дзе яно было ў языццэ праславянскім. Дык цяперашняе крывіцкае j перад і зь *jь-(jіскра, jімя) ды такое-ж у языццэ чэскім (jinak) ня толькі протэтычнага паходжаньня, але й зьявілася пазьней. Што да языка крывіцкага, дык аўтар „Аль кітабу" яшчэ ня чуў у гэтых словах j перад і.

а подле сваіх словаў араб. *Алі* зьмянілася ў *Алей.* Ад араб. aźan (гуканьне на малітву) утварона на беларускім грунце назоўн. імя aźančij (сьвяшчэньнік, пяючы»азан«). У вараб. языццэ гэтага слова няма, там *муэзін.* Менаванае слова сустракаецца ў рукапісе звычайна з-ij, прыкл.: Aźančijove 88b12, 91b7, 90b15, але нярэдка такжа з—ej: aźančejoŭ 90b10 і інш. Значыцца, бачым тут хістаньне ў тым самым слове між хормаю на -ij і-ej.

b) Такжа ёсьць -ej на месцу -ьj у instr. sg. i- асноваў жан. р.: śvetłaśćeju 114b8, iz jeho miłośćejū 69a13 і інш.

c) -ej на месцу-ьj маюць далей у gen. pl. substantiva (наз. імёны) i- асноваў, а подле іх і некаторыя імёны іншых асноваў: rečej 26a5, pavinnaśćej 53a10, ačej 127a6, hrošej 47a14 dzećej 48a14, kanej 110b4, t'is'ečej 29b11 і інш.

У старакрывіцкіх памятках у старшую пару ё канчатак *-ии*, а пазьней зьяўляецца *-ей.* Гл. Карскі, II-1, 259—261. З гэтага відаць, што спачатна ў беларускім языццэ канчатак *-ьj* nom. sg. masc. назоўных імёнаў перайшоў у -ij, каторае пазьней было зьменена на -ej. Подле хормаў на -ij было ўтварона такжа aźančij, а пазьней, як і ўсе іншыя імёны з гэтым канчаткам, мяняла -ij на -ej. Бяссумлеву замена канчатку -ij на -ej настала пад уплывам іншых хормаў, а пайменна subst. masc. nom. sg. аналёгіяй таковых словаў, як *купец, стралец, малец;* прыр. схр. zmâj (=зьмей) побач із *-i* ў nom. sg прыметаў.

e замест *i* ў instr. sg. жаноцкіх i- асноваў (*міласьцяю* і пад.) паўстала пад уплывам прыметаў (*сіняю* і пад.).

На паўстаньне *e* ў gen. pl. i- асноваў, як добра думае Карскі (Русская диалектология), магло ўплываць *e* ў-ech з-ьchъ loc. sg. i-асноваў (ludzech).

У цяперашняй мове i- асновы маюць у gen. pl. блізу вылучна канчатак -ей (кір. -еў). Значыцца, gen. pl. падпадаў пад шмат якія ўплывы, а substantiva мяккіх асноваў двойчы мянялі ў ім свае канчаткі.

3. у, і на месцу *ъ, ь* перад j маем такжа ў хормах асновы цяперашняга часу некаторых дзеясловаў: 'abmij 11a9, nakrij 48b10, 'umij 48b15, mijūči 49a5, 'ebmiješ 49a11, pamij 49a12, 71a14,71b15, vimij 71a7, mijce 72a17, 72b1, 107a10, nakrijecca 137a4, bijce 53b15, 'uz'lij 71b12, pijce 16a2, šijuči 49a16 і інш.

Тое самае ў назоўных імёнаў тых-жа каранёў: šiji 41b9, šiju 59b7, na šiji 65b14, 72b7, 129b9, šija 110b3 і інш.

Прыраўнальная ступень (comporativa) на -ej: bližej 1a2, lepej 22b5, 26b16, 28a17, bolej 23a14. višej 39a1, horej 51b4, dalej 53b13 і пад. сюды не адносіцца, бо гэта складзеныя хормы прыраўнальнае ступені ніякага роду з адпалым канцавым *-e.* Прыр. у яз. пол. więcej, dalej і пад. Rozwadowski, Gramatyka jęz. pol., Кракаў 1923, 149).

Побач із вышменаваным у іншай групе прыпадкаў *ь* перад j чэзьне. Гэта ёсьцека:

a) у цяперашнім часе некаторых дзеясловаў: bje 59b9, ubjuc 53b13, vipjū 114a8 і інш. ды ў йменаў: pjanstva 63a16, pjanstve 62b13.

b) у йімён на -ьje, -ьja, галоўна зборных і дзеяслоўных (collectiva et deverbativa): chełapja 2b6, 56a1, davana 18a7, 'adpū-ščene 23a11, 'Abrekane 23b3, chreścanin 112a9, chreścanmi 4b8.

Там, дзе беларускі (крывіцкі) язык на месцу *ъ, ь* перад j мае у, і (кір. *ы, і*), маюць гэтыя гукі так-жа ўсі асталыя языкі славянскія, з выняткам расейскага. У літаратурным языццэ расейскім, *о, е* ё заўсёды ў хормах асновы цяперашняга часу дзеясловаў kryti, ryti, myti, vyti, nyti, briti, liti, šiti, piti, viti*), але ў nom. sg. складзеных прыметаў ё *о* адно пад націскам (*молодой*) , а калі на канчатку няма націску, дык маем -уj *(старый)*. У паўночна-расейскім нарэччу ё толькі *-oj, -ej,* бяз розьніцы ё ці няма націску на канчатку (*молодой, старой, синей*). Паўдзённа-расейскае нарэчча (абруселая мова беларускіх Вяцічаў) спачатна мела ў гэтых прыпадках толькі *у-*, *і* (кір. *ы*, і), як у складох націсьненых, так і ненацісьненых; цяперака паўдзённа-расейскае нарэчча пад уплывам паўночна-расейскага мае ў бальшыні *-oj***). З гэтага бачым, што літаратурны язык расейскі разьвіў компромісны спосаб ужываньня прыведзеных хормаў між паўночна- і паўдзенна-расейскімі нарэччамі.

ПАВАЖАНЫ ПАНЕ РЭДАКТАР!

У № 3 „Калосься“ за 1938 г., бач. 176, д-р Я. Станкевіч піша, што я падаў формы займеньніка **кажны, кажан.**

Дзеля ўстанаўленьня праўды падаю да ведама, што каля Мазыру гавораць: **кажны, кажын,** *але ніколі й нідзе я ня чуў формы* **кажан.**

Зварочваў я таксама ўвагу д-ра Станкевіча й на тое, што не гаворыцца: **Мозыр,** *але* **Мазыр,** *каля* **Мазыру,** *у* **Мазыры.** *Відаць, ён гэтае забыў. Для такога лінгвіста, якім зьяўляецца д-р Станкевіч, справа гэтая не павінна быць благой. Маё вуха дзярэ, калі я чую „Мозыр“.*

Падчас вялікодных сьвят я слухаў радыё-перадачу з Мазыру. Менскі speaker, як заўсёды, заявіў: „Лучымся з Мозырам“. Мяне цікавіла, што скажа Мазыр. Пачуўся голас нейкага жыда: „Увага! гаворыць Мазыр“. Я ўздыхнуў лягчэй — хоць жыд, але мазырскі.

У сувязі з гэтым паўстае пытаньне аб выданьні беларускага географічнага слоўніка. **М. Анцукевіч**

Ломжа, 30.V. 1939 г.

---

*) У вапошніх 4-х дзеясловах **е** ё толькі ў хормах загаднага ладу (imp.), а ў цяперашнім часе **ь** шчэз.

) Шахматаў: „Въ настоящее время южновеликорусское нарѣчіе представляетъ рядъ чертъ общихъ съ нарѣчіемъ сѣверновеликорусскимъ, но все это — черты позднѣйшія (напр. окончаніе **-ой, вм. **-ый** въ им. ед. ч. **худой** или **о** вм. **ы** въ **мою**).“ Введеніе въ курсъ ист. р. яз., 54.

АД. СТАНКЕВІЧ

З літуанізмаў у беларускай мове

Л.

Лешка — града, градка, загон (зямлі); магчыма ад: літ. **lise** — значэньне, як вышэй, або ад **liesas** — худы, сухі, сухарлявы; лешка —малы, «худы» кавалачак зямлі, **liesti (liesta, lieso)** — худзець. Адгэтуль — ляшыць, напр. ляшыць жыта, гэта знача: на полі, дзе пасеена жыта, праводзіць барозны, рабіць загоны й такім чынам рабіць яго сушэйшым, лягчэйшым, «худзейшым».

Лупа — губа; у чалавека — губа, у зьвярат, асабліва ў вялікіх, як конь, карова — лупа; **lupa** — губа (агулам); **lupos** (множны лік) — вусны.

Латак — дошчачка з раўчуком па сярэдзіне, або прадзюраўленая палачка, якая ўбіваецца вясной у дрэва, каб па ей сьцякаў у падвешаную пасуду сок; літ. **latakas** — жолаб, роў, канава, пратcallok, ручэй. Адгэтуль і **Łotoczek** — вузкая й спадзістая вуліца ў Вільні.

Лагожы — няправільны чварабок, зьбіты з чатырох жэрдачкаў ці брусочкаў, што накладаецца на сані, каб яны былі больш пакоўныя; літ. **lagaminas** — валіза, клунак.

Луста — ськіба, ськібка (хлеба); літ. **lustas** — роўны пласт (сьнегу), кусок (цеста), роўны ком (сена).

Лігі — засьценак у Гальшанскай вол.; літ. **lygė** — роўнае месца, роўная сенажатка сярод лесу.

Лындаць — бадзяцца, хадзіць і нічога не рабіць, расейскае—**праздно шататься**; літ. **listi (lenda, lindo)**—лезьці, узлазіць, совацца. Чаго ты лындаеш, узяўбы ды рабіў-бы што!

Лабуніць, — прыбліжаць, запрашаць, падсядаць, намаўляць,; літ. **labinti** — кланяцца, вітаць.

Ланкаваты — выхілясты, угнуты; яго конь добры, але ланкаваты; гэта знача — угнутая сьпіна; літ. **lankas** — дуга, абруч, обад, аколушка; **palankus** — прыхільны.

М.

Мянтушка — лапатка вастрыць (мянціць) касу, літ. **mentė** — лапатка (анатамічнае й агулам).

Маркеняты — вёска Крэўскай вол.; літ. **markyti** — мачыць, размачваць.

Мірклішкі — вёска (там-жа); літ. **mirklioti** — міргаць, **mirkla** — міргун.

Мілта — ком з намочанай аўсянай мукі (патрава); літ **miltai** — мука.

Маргель, марга — назовы рабых: вала і каровы; літ. **margas** — стракаты, пярэсты, рабы.

Мілэйкава, **Мялэйкава** — вёска ў Крэўскай вол.; літ. **mylëti (myli, mylėjo)** — любіць (каго), прымаць (гасьціць).

Н.

Наўда — карысьць, багацьце; літ. **nauda** — тое-ж.

Нарвілішкі — сяло ў Віленска-Троцкім пав.; літ. **narvas**, **narvelis** — клетка, матачнік (у сотах вульля).

Нерат, нерэт — рыбалоўскі прылад, сплецены з пруткоў. Патрасі нерат! Папаў у нерат — ні ў зад ні ў перад; літ. **nerti (neria, nërė)** — плесьці, нізаць (нітку), накідаць (пятлю на шыю), надзяваць (пацеркі), даваць нурца.

Няўрымсьціць — быць неспакойным, не ўспакойвацца; конь аж ня ўрымсьце, што рабіць; літ. **nerimti (rimsta—rimo)** — тое-ж самае.

П.

Пойсаць — ачышчаць. Пойсаць ячмень. Пасьля малацьбы ячмень яшчэ нячысты, яго зярнё трэба яшчэ ачышчаць, пойсаючы яго, б'ючы цапом; літ. **nupaisyti** — правеіць, вымалаціць, ачысьціць (ячмень).

Петавацца — цяжка, у поце працаваць. Ён бедны петуецца, петуецца, а карысьці ня мае; літ. **pietus** — паўдзень, палудзень, **pietinis** — паўдзённы, цёплы, гарачы.

Парсюк — вепр, вяпрук, літ. **paršas, paršiukas** — тое-ж самае.

Платацца — бегаць (па полі), бываць (у шырокім сьвеце), ехаць быстра; эх, і платаецца-ж ён! літ. **platėti (plateja, platejo)** — шырэць, расшырацца, пашырацца.

Пярыць — хусьце ці палатно на рэчцы паліваць вадой і біць **пранікам**; літ. **perti, (peria, pérė)** — біць (каго, што), хвастаць (венікам), парыць (каго ў лазьні), **(iš)perti** — даць каму «лазьню».

Прамануць — прыдумаць, надумацца; праманўў хадзіць у гарох! Сьвіньні праманулі лазіць у бульбу; літ. **pramanyti (pramano, pramanė)** выдумаць.

Паляпіць — панадзіцца, звабіцца, збалавацца. Паляпіў хадзіць у госьці і рады мала! літ. **(pa)lepinti (lepina, lepino)**— балаваць, песьціць, прывучаць.

Посайка, пасойта — перавязь вядра; літ. **pasaita** — прывязь, перавязь, перавесла, прывязь цапа, вяровачка, што счапляе пугу (біч) з пугаўём (з бічыскам).

Пошар — сухі корм для скаціны; літ. **pašaras** — тое-ж самае; **(pa)šerti (šeria, šėrė)** — пакарміць, накарміць (рагатую скаціну, авец, каней).

Прагаліна — пустое месца ў лесе, на лузе і таму пад.; літ. **praga** — пустое месца, тое-ж, што і спрага (націск на канцы).

Праварына — перагародка ў хлеве, загарадка, адгародка; літ. **pravarinė** — тое-ж самае, **pravaryti** — перагнаць (міма, праз, наскрозь).

Пераджаргаць, ажаргаць — пераступіць (праз каго, што), асядлаць; літ. **peržergti (peržergia, peržergė)** — тое-ж самае.

Пратаць, упратаць, прыпратаць — прывучыць, накланіць, накіраваць; я хацела свайго сына ўпратаць у духоўную сэмінарыю; літ. **pratinti** — прывучаць, навучаць.

Пуня — гумно, стадола; літ. **punė** — будка, канура, хлеў, канюшня.

Путра — полеўка, пахлёбка; літ. **putrá** — просты крупнік, пойла (для цялят).

Патураць — патакаваць, згаджацца з чыей воляй, жаданьнямі; зашмат ты свайму сыну патураеш; літ. **paturėti (paturi, paturėjo)** — паддзяржаць, падтрымаць, падзяржаць, магчы дзяржаць.

Пасютаць (спасютаць) — згубіць што праз недагляд, праз дуронства; ужо нейдзе шапку сваю спасютаў! літ. **pasiusti (pasiunta, pasiuto)** — здурнець, ашалець, сыйсьці з розуму.

А. ІВЭРС

Звоняць дні...

Вершам мо' няўдалым,
але проста —
з сэрца
прывітаю далі
ў руністых каберцах!

Жменяй сыпну
поўнай
буйных думак —
росы,
дзе туману воўна
затуліла просінь. —

Сонца азалоціць
росы на загонах...
Звоняць дні на дроце,
звоняць,
звоняць,
звоняць...

Пацягну я смыкам
па сталёвых жылах —
ды каб
хмелем дзікім
песьня закружыла!

Каб
на перавалах,
палыном заросшых,
стаць гарою, скалай —
долю сваю рошым!

СЯРГЕЙ САХАРАЎ

Полацкі князь Усяслаў—нацыянальны беларускі асілак

Усе жыхары прыгожай беларускай староні павінны любіць сваю родную старасьвеччыну й ею цікавіцца. Традыцыі глыбокай полацкай старасьвеччыны ў памяці ўсіх Беларусаў, у жылах каторых цячэ старaславянская кроў Крывічоў, павінны быць жаралом вечнага натхненьня.

Мінуўшчына важная йшчэ й дзеля таго, што толькі ў ейным асьвятленьні можна правільна зразумець і належна сабе ўявіць задачы сучаснага гістарычнага мамэнту й ісьці па правільнай дарозе да сьветлай будучыні свайго народу. Тымбольш важным ёсьць кінуць хоць адзін-другі прамень сьвятла на тую далёкую эпоху ў гісторыі беларускага краю, калі над ім залунала заранiца сваей гаспадарственнасьці, калі на берагох Дзьвіны былі паложаны першыя каменьні асноваў беларускай культуры, калі беларуская палітычная думка стала пературацца ў форму выразнай палітычнай цэласьці.

А гэта пачалося даўно—больш васьмісот гадоў таму назад...

У гэту далёкую пару сэрцам Беларусі быў стары сусед Віцебска — слаўны Полацак, гаспадарственная ўлада каторага была ў жалезных руках магутнага Полацкага князя-багатыра Усяслава, а імя Палачан, «грозных Палачан», як кажа аўтар «Слова аб палку Ігаравым», з славаю разнасілася рэхам народнай весьці ня толькі па многаводнаму басэйну Дзьвіны, але й далёка паза ягонымі граніцамі.

Гісторыяграфія знае ня мала важных дасьледчыкаў, што займаліся дасьледаваньнем мінуўшчыны й сучаснасьці беларускага народу. Сярод іх заслужанаю павагаю карыстаюцца імёны прафэсараў: Пецярбурскага — М. О. Кояловіча, Маскоўскага — І. Д. Беляева, Кіеўскага — М. Доўнар-Запольскага, Варшаўскага — Е. Ф. Карскага; глыбокіх знаўцоў беларускай старасьвеччыны — А. М. Семёнткоўскага, А. П. Сапунова, Д. І. Даўгялы й інш. Аднак самае толькі існаваньне гэтулькіх аўторытэтаў не дае йшчэ права цьвердзіць, што ўсе пытаньні ў справе княжага пэрыяду гісторыі старасьвецкага Полацку ўжо вырашаны безпаваротна й аканчальна. Не! Там ёсьць яшчэ шмат чаго навукова недасьледаванага, загадачнага й цікавага... Гэта зусім натуральна, калі прыняць пад увагу тое асаблівае, бадай выключнае палажэньне, якое Полаччына займала сярод іншых суседніх земляў, а так-жа, калі прыняць пад увагу самы характар гэтай староні, ведамай з летапісных жаролаў.

Полацкая зямля X—XI в. для земляў Прыдняпранскіх была далёкай акраінай, гістарычнымі падзеямі высунутай у су-

седзтва з літоўскімі й чудзкімі плямёнамі. Ужо ў самым заранъні легендарна-паэтыцкай дымкі, прыцярушыўшай найдаўнейшую гісторыю гэтай зямлі, адбіваецца апрычонасьць паўдзённае, украінскае Прыдняпраншчыны ад Палачан, закінутых у глухую даль, паміж дрымучых лясоў і топкіх балот Беларусі. Гэты факт апрычонасьці зямлі Крывічоў ад рэшты Русі зазначаюць усе аўторытэтныя жаролы. «Крывічы — ка жа Н. Костомараў — былі раз'яднаны з Паўдзённай Русьсю й жылі асобным сьветам[1])».

Насьледкам такой раз'яднанасьці было выдзяленьне Полацкіх князёў з агульнай сям'і патомства Кіеўскага князя Уладзімера.

«Перш за ўсіх ізгоеў[2]) — піша праф. Ключэўскі — у палажэньні выдзеленых князёў апынуліся, ня дзеля раньняга сіроцтва, але з прычыны асаблівых варункаў, князі Полацкія, патомкі старшага Уладзіміравага сына ад Рагнеды».[3])

Праф. Багалей прадстаўляе выдзяленьне полацкіх князёў і адасабленьне Полацкага Княства, як адно цэлае. «Адасабленьне Полацкага Княства пачалося вельмі рана — яшчэ пры Уладзімеры Сьвятым, узяўшым сабе за жонку дачку Полацкага князя Рогвалада й аддаўшым Полацкі пасад Рагнедзінаму сыну — Ізяславу.[4])

Полаччына, як кажа праф. А. Трачэўскі, была «адрэзаным акрайцам у рускай гісторыі ўдзельнае пары, падобна, як і Галіччына».[5]) Вось-жа гэта «адрэзанасьць», гэта адлучанасьць Полацка ад агульнарускага караня й былі прычынаю таго, што гісторыя княжага пэрыяду Полаччыны прадстаўлена ў летапісных аглядах толькі ў форме кароткіх, фрагмэнтарычных, часам непавязаных з сабою вестак. Па загубленьні-ж сваіх мясцовых полацкіх летапісаў, гістарычная навука асталася без магучай успамогі дзеля правільнага разуменьня й магчымасьці ўсебаковага асьвятленьня гэнай важнай культурна-палітычнай эвалюцыі, якую перажылі Крывічы ў басэйне Дзьвіны ў X—XII в. А эвалюцыя гэта была вельмі характэрная: у той час, калі Ноўгарадзкія Славяне на берагох Волхава імкнуцца апрацаваць у сябе палітычную форму дэмакратычнага рэспубліканства, Полацкія Крывічы на берагох Дзьвіны, праз сваіх свабодалюбівых князёў, стараюцца сконцэнтравацца ў незалежнае Крывіцкае княства, сарганізаваць незалежную дзяржаву (гаспадарства). Гэтым і тлумачыцца жор-

1) Н. Костомаров: Истор. монографіи і изслѣдованія, том І, Пецярбург 1872, бач. 12.

2) Ізгоямі наз. князі, выключаныя з радовага старшынства й адлучаныя ад учасьця ў агульным валаданьні зямлёй.

3) В. Ключевскій: Курс Русской Исторіи, ч. І, выд. 2, Масква, 1906 г., бач. 222.

4) Д. И. Багалѣй: Русская Исторія. Харкаў 1909 г. бач. 173.

5) А. Трачевскій: Русская Исторія, ч. І, Пецярбург 1895, бач. 70—71.

сткая барацьба Кіева з Полацкам, закончаная нябывала трагічным эпілёгам — ссылкай полацкіх князёў у Царгорад.

Недастатак мясцовых летапісных вестак аб Полацкіх здарэньнях тым больш даецца горка адчуць, што аўтары Кіеўскіх і інш. летапісаў, з каторых і даведваемся аб гэтых здарэньнях, не маглі быць да Полацка безстароннымі. Наадварот, у Кіеве імя Полацка ў старыя часы, паводле ўсяго, выгаварвалася з адценкам глыбокай упярэджанасьці, задорным тонам забабону...

Дакумэнтам гэтага зьяўляецца цікавая легенда «о предивном чюде у Полотську», згодна з Іпацкім, а йшчэ лепш Цьвярскім летапісам «об устрашеніях и мечтах бѣсовских в Полотску при князѣ Всеславѣ». Летапісец у наіўна-дзіцячым тоне расказвае аб штуках бясоў над Палачанамі на гарадзкіх вуліцах і пляцох падчас пануючай у Полаччыне ў 1092 г. нейкай пошасьці, захапіўшай з сабой многа людзкіх ахвяраў. Сам факт вялікага пашырэньня гэткай легенды, якая сталася нават сюжэтам народнай дасьціпнасьці й запісана з многімі варыянтамі ў шматлікіх летапісных аглядах, зьяўляецца выразным доказам, як адносіліся суседнія землі да далёкай Полаччыны. Падобна таму, як Літоўская зямля доўгі час лічылася жаралом усялякіх дзіваў і чараў, гэтак краіна Полацкіх Крывічоў у XI—XII в. слыла, як старонка чараў і загадачных зьяваў, лічылася нейкім зачараваным кутком.

Незважаючы на гэткую легендарнасьць вестак аб старым Полацку, адна магутная асабістасьць з сям'і Полацкіх князёў пакінула па сабе вельмі яркі й выразны знак на фоне ўдзельна-вечавой гісторыі. І быў час, калі імя гэтай асобы шырака разнасілася ў народнай погаласцы ў самыя далёкія куткі ўдзельна-вечавой Русі; калі імя гэта было аднолькава слаўным і грозным ува ўсіх слаёх тагочаснага грамадзянства, пачынаючы ад ягоных вярхоў, у асобах прадстаўнікоў многалічнай княжай сям'і Рурыкавічаў, і канчаючы глыбокімі нізамі народу пад відам ці то неспакойных грамадаў свабодалюбівага веча на Кіеўскім рынку, ці то цёмных масаў чужаземнага насельніцтва, у родзе фінскага племя — Воді.

Гэта імя было імем *Полацкага князя Усяслава.* Гэты слаўны князь пракняжыў у Полацку цэлых 57 гадоў (1044—1101 г.г.). Лічба нязвычайная нават для багатай вялікімі людзьмі ўсесьветнай гісторыі.

Асоба князя Усяслава Брачыславіча цікавая так-жа й з іншага боку: падобна як і многія з вялікіх людзей, князь гэты пакінуў па сабе ў гісторыі падвойны сьвет, дваякую памяць: „Слова аб палку Ігаравым" творыць Усяславу сьветлы арэол адважнага ваякі, добрага панаўніка, справядлівага судзьдзі й народнага героя, а з другога боку—Усяслаў быў героем паэтычнай казкі й народнай фантастыкі: летапіс рысуе нам яго, як „рожденного от волхвования" і „няміласэр-

нага на праліцьцё людзкой крыві", урэшце паэтыка народных пяўцоў з гістарычнага Усяслава вытварыла тып казачнага перакіншчыка, каторы „днём людзей судзіць і ўпраўляе князёўскімі гарадамі, а ўночы воўкам носіцца".

Але прыступім да характарыстыкі нашага беларускага нацыянальнага героя — князя Усяслава Брачыславіча.

Як адпраўны пункт дзеля характарыстыкі Полацкага князя возьмем водклік аб ім летапісных жаролаў з 1044 году:

„В лето 6552, — чытаем у Лаўрэнцеўскім летапісе,—умре Брячислав, сын Изяславль, внук Володимера, отець Всеслав, и Всеслав, сын его, седе на столе его, его-же роди мати от волхвования; матери-бо родивши его, бысть ему язвено на главе его: „се язвено навяжи нань, да носит е до живота своего", „еже носить Всеслав и до сего дне на себе; сего ради немилостив есть на кровопролитие".

Гэткі, так сказаць, палітычны пашпарт выдадзены летапісцам Усяславу Брачыславічу ў важны для яго год пасаджэньня яго на Полацкі пасад, у важны мамэнт выступленьня яго на сцэну гісторыі.

Так ці йнакш, але ўспомненая цытата з Лаўрэнцеўскага летапісу адносіцца, бяз сумліву, у лік загадачных бачынаў летапіснага тэксту. З аднаго боку чуваць тут водгалас усім ведамай казкі аб чарадзею Волху й старасьвецкай быліны аб багатыру Волху Усяславічу, з другога боку — казачна-былінная фантастыка умела тут пераплеценая рэальнасьцю прастадушнай легенды аб загадачным „язвено на главе его" ад самага нараджэньня й аб насімым ім чарадзейскім талізмане. І ў гэткую вось рамку, дзіўна размалёваную паэтыкай і забабонам народных погаласак, устаўлены аканчальны пагляд аб маральным вобліку князя, як чалавека суровага й неміласэрнага на кровапраліцьце. Падобная характарыстыка асабліва падатную глебу дзеля свайго распашырэньня магла знайсьці іменна ў Кіеве, пад уладу каторага не хацеў скланіць сваей гордай галавы магучы Полацкі князь.

Але на паказаньне аб чарадзейскім нараджэньні Полацкага князя ня можна глядзець толькі, як на звычайны прадукт забабоннасьці й народнай цемры.

Нараджэньне людзей «от волхвования" і наагул наднатуральнае іхняе паходжаньне былі звычайнымі, так сказаць, валацужнымі сюжэтамі старадаўніх вераваньняў у арыйскіх народаў. На здольных арганізатараў свайго цывільнага й ваеннага жыцьця арыйцы наагул глядзелі, як на асабліва ўздольненыя істоты, як на вялікіх герояў і магутных паўбагоў, якія паходзяць ня так, як усе людзі, але зьявіліся на зямлі спосабам наднатуральным (грэцкая мітолёгія — Геракл), чараўніцкім і найчасьцей прыймалі форму баснаслоўных апісаньняў аб нараджэньні іх з зямных матак, а ад бацькоў паходжаньня нечалавечага, галоўным чынам ад зьмеяў, якія ўва-

жаліся ўцелаішчэньнем нязвычайнай мудрасьці й дэманічнай хітрасьці.

Дзеля гэтага, ня трудна прадставіць, пры якіх варунках сярэднявечная й агульнаарыйская традыцыя маглі злучыцца з героічнаю асобаю Полацкага князя. Чалавек, які задзівіў народныя масы свае пары львінаю адвагай, жалезным характарам, нясчэрпанай энэргіяй і рашучай быстрынёй нанасімых udaraў; князь, які патрапляў нязвычайна ўдачна вырывацца з самых цяжкіх абцугоў, блізу безнадзейных палажэньняў, у паняцьці народу ня мог зьявіцца парадкам натуральным. Не, ён павінен быў радзіцца па чарадзейску—„от волхвования".

Пры выясьненьні прычын, дзеля якіх асоба Усяслава Брачыславіча асталася ў агульна народнай памяці з тыпічным арэолам чарадзейнага нараджэньня, трэба так-жа канечна прыпадняць занавесу над яшчэ больш цікавым кутком у псыхолёгіі самай крывіцкай паэтыкі.

У дагістарычную эпоху, калі йшчэ ня было раздрабленьня Крывічоў на паўночных і паўдзённых, на пскоўскіх і полацка-смаленскіх, вуснае паэтыцкае творства гэтага племяні, натуральна, цяклоадным супольным руслом. Але, у меру адасабленьня аднаго ад другога паасобных галін племяні, выражэньне паэтыцкага творства іх у казках і былінах стала разрозьнівацца. Аднак, першая супольнасьць паэтыцкіх традыцыяў, мотываў, сюжэтаў, нават мясцовага колёрыту, у творчасьці счэзнуць не магла. Гэта выразілася ў цікавым працэсе вытварэньня з гістарычнага Усяслава легендарнага пераkіншчыка й чарадзея. Мы хочам гэтым сказаць, што на гістарычную асобу Полацкага князя крывіцкая творчая думка пакінула паэтыцкую вопратку быліннага багатыра Вольха Усяславіча, а гэты апошні ў сваю чаргу апранены быў ею ў фантастычную вопратку чарадзея Волха, героя з казачнага эпасу.

Гэта ўнутраная пасваячанасьць двух тыпаў—казачна-песеннага й легендарна-гістарычнага—станецца йшчэ больш канкрэтнай пры падрабязным супастаўленьні рысаў Усяслава Брачыславіча, як ён нарысаваны ў летапіснай казцы й у прыпеўцы вешчага Баяна, з рысамі Вольха Усяславіча — паводле дзьвюх захаваных аб ім былінаў.

Летапіс кажа: „сего Всеслава мати роди от волхвования". Гэты сухі й лякані чны фрагмэнт сачыстымі фарбамі быліны, запісанай у зборніку А. Данілава, размалёваны ў наступны жанравы абраз:

„По саду, саду зелёному, ходила, гуляла
Молода княжна Марөа Всеславьевна,
Она к камени скочила на лютого, на змея.
Обвивается лютой змей около чебота зелен-сафьян
Около чулочика шелкова, хоботом бьёт по белу стегну
А в то поры княгиня понос понесла,
А понос понесла и дитя родила".

(быліна VI, бач. 38)

Як істота надпрыродная, ад самага ўжо свайго нараджэньня, як сын зьмея-перакіншчыка, багатыр Волх Усяславіч мае прароцкую прыроду. Згэтуль становіцца зразумелым, чаму падарожныя калекі ў павучальнай прамове Ільі Мурамцу адзначаюць у Волха іменна „хітрасьць-мудрасьць".

„Не ходи на Вольгу Сеславьевича
Он не силою возьмет,
Так хитростью-мудростью".

У прыпеўцы вешчага Баяна, запісанай у „Слове аб Палку Ігараве", Полацкі чарадзей таксама названы „хитрым, гораздым и человеком вещей души".

Як ведама, перакіншчыцтва было спадкаемнай рысай Волха й былінная фантастыка справядліва прадстаўляе гэта перакіншчыцтва, як нутраную канечнасьць, як арганічны поклік багатыра з самага ягонага дзяцінства.

„Стал Вольга растеть-матереть
Похителя Вольге много мудрости
Щукой-рыбой ходить ему в глубоких морях,
Птицей-соколом летать под оболока
Серым волком рыскать во чистых полях,

На князя Усяслава народная фантастыка глядзіць таксама, як на перакіншчыка-ваўкалака. У мірным часе:

„Всеслав князь людем судяше, князем грады радяше, а сам в ноч волком рыскаше".

У ваенным-жа часе Усяслаў адзначаецца хуткасьцю імкненьня сваіх рухаў у прасторы:

„Скочи лютым зьверем в полночи из Белграда, скочи волком до Немиги с Дудуток"; „из Киева дорыскаше до Тьмутораканя" і інш.*)

Гэтак сама быстры багатырскі скок у Волха Ўсяславіча:

„Побежал Волх к царству Индейскому,
Он первый скок за целу версту скочил,
А другой скок не могли найти".

Рысы вядзьмарства й чарадзейства праяўляюцца ў Усяслава надпрыродным чуцьцём гукаў з далёкай адлежнасьці:

„Тому в Полотьске позвониша заутреню рано у святыя Софии в колоколы, а он в Киеве звон слыша".

Волх Усяславіч таксама абдараны падобнаю казачнаю здольнасьцю:

„Ясным соколом он мчится к царству Индейскому, садится на косящатом окошке палат белокаменных и слышит таинственный разговор царя Салтыка з царицей Азвяковной".

Паводле летапіснай казкі, князь Усяслаў «немилостив был на кровопролитие». А ў Волха лютасьць была быццам спадкаемнай рысаю, ад чаго й атрымаліся гэтак суровыя наказаньні:

„Гой еси вы, дружина хоробрая,
Ходите по царству индейскому

*) „Слова аб Палку Ігаравым".

Рубите старого, малого,
Не оставьте в царстве на семена".

Такім чынам, для нас яснай становіцца гэна лябораторыя, у каторай паэтыцкая творчасьць Крывічоў з паганскай веры ў чары, з рэлігійнай фантастыкі твора чарадзейную казку аб багатыру-чарадзею Волху, а праз яго ў мастацкай пераапрацоўцы прафэсыянальных пераказчыкаў прыгатаўляецца прыгожы сюжэт для разбудоўкі чароўнай апотэозы свайму нацыянальнаму герою — князю Усяславу, каб паказаць ягоную адчайную схватку з Кіевам і Яраславічамі, каб прадставіць ягоныя сьмелыя паходы супроць Ноўгарада й Пскова.

Цяпер зьяўляецца пытаньне, кім-жа ўласьціва быў магутны Крывіцкі князь, як гістарычны тып, грамадзкі дзеяч і як маральны характар; ці справядлівы быў пагляд летапісца на суровасьць князя («сего ради немилостив был на кровопролитие»)?

Каб устанавіць правільны й об'ектыўны пагляд на асобу Полацкага князя Усяслава, канечна трэба сабраць у адзін цэлы абраз увесь матарыял з гісторыі ўзаемаадносінаў Усяслава, як Полацкага князя, да сучасных яму князёў і суседніх краёў, а так-жа выясьніць барацьбу Усяслава з сваімі ворагамі за самастойнасьць і незалежнасьць Полаччыны з пункту гледжаньня тых культурных варункаў, акія існавалі ў другой палавіне XI стагодзьдзя ў удзельнай Русі. Тады з туманнай далячыні сівой старасьвеччыны прад намі пакажыцца не фантастычная, але рэальная фігура; зьявіцца не пахмурны герой паэтыцкай, летапіснай легенды, але сапраўдны гістарычны дзеяч свае пары.

У летапісных жаролах ёсьць шмат матарыялаў дзеля характарыстыкі ваенных парываў Усяслава Брачыславіча. Летапісныя агляды пры гэтым ня рэдка стараюцца прыпісаць ініцыятыву сварак іменна Полацкаму князю. Звычайна ў такіх выпадках аўтары летапісных аглядаў ужываюць сумысных тэхнічных выражэньняў, напр. «поча Всеслав рать держати», «князь Всеслав приисед ратию», «Всеслав седе рать почал» і г. п.

1. Першым у хронолёгічным парадку здабыўніцкім паходам Полацкага князя быў ягоны набег на м. Пскоў у 1065 г. Другі Пскоўскі летапіс прадстаўляе гэта здарэньне так:

„В лето 6573 князь Полоцкий Всеслав събрав силы своя многия, приде ко Пскову, и много труждався отъиде, ничтоже успев".

2. Больш шчасьлівым і удачным быў раптоўны напад Усяслава на Ноўгарад Вялікі ў 1066 г.

„В лето 6574 приде Всеслав и възя Новгород с жёнами и детми и колоколы съима у святыя Софии.1) О, велика бяше бѣда в час тый и понекодила съима" (1-шы Ноўгарадзкі летапіс).

1) Гэтыя званы (колоколы) Усяслаў перадаў Полацкай Царкве сьв. Софіі.

3. Трэцім па парадку здарэньнем, у якім відавочна знайшла для сябе апраўданьне летапісная характарыстыка бязлітаснага характару Полацкага чарадзея, быў ведамы з свае крываваcьці бой яго з трыма Яраславічамі ў сакавіку м-цы 1067 г. на берагох ракі Нямігі. Гэта бітва адбылася зараз-жа пасьля таго, як саюзнае войска князёў паўдзённай Русі, разграміўшы верны Усяславу Брачыславічу Менск, выбіўшы ў ім мужчынаў і забраўшы ў палон жанчын і дзяцей, урвалася ў паўдзённа-усходнюю часьць уласьцівай Полаччыны. Усяслаў сьмела загарадзіў тут дарогу сваім лютым ворагам і пагеройску ўступіў з імі ў бітву.

Крывавая схватка Палачан з паўдзённа-русамі на берагох Нямігі[1]) паслужыла паэтыцкім сюжэтам для вусна-народнага песеннага эпасу. Адгалоскам яго якраз і быў абраз бітвы, прадстаўлены аўтарам «Слова аб палку Ігаравым» ў земляробскіх нарысах малацьбы й веяньня:

> „На Немизе снопы стелють головами, молотять чепи харалужными; на плоце живот кладуть, веють душю от тела. Немизе кровави брезе не болохом бягуть посеяни, посеяни костьми русских сынов".

Акрамя адзначаных выступленьняў Усяслава Брачыславіча, трэба адзначыць ягоную абарону Полацкага пасаду ў 1070 г. ад сілком накіненага Палачанам князя Сьвятаполка Ізяславіча, ягоны трэці напад на Ноўгарад у 1077 г. і завалаланьне Смаленскам у 1078 г. Але за апошняе ён сьцягнуў на сябе гнеў Уладзімера Манамаха, каторы разам з князем Сьвятаполкам і гордамі дзікіх полаўцаў асадзіў Полацак і ў выніку прадмесьці яго былі спалены, але самая крэпасьць устаяла... Словам, ніякія жорсткасьці саюзьнікаў, ні іхнія грабяжы Полацкай зямлі, нават азьвярэласьць і барбарства полаўцаў, ня змусілі аднак Полацкага князя адказацца ад абароны незалежнасьці свае бацькаўшчыны й ад сапраўдных задачаў ягонай эканамічнай палітыкі, заветная мэта якой была: валадаць гандлёвымі шляхамі ў басэйнах Дзьвіны й Дняпра.

Дзеля правільнай ацэнкі маральнага аблічча Усяслава, ня можна забывацца й аб тым, што ў барацьбе з Кіевам князь гэты прадстаўляецца ня гэтулькі ў фарбах урачыстых перамогаў над бязлікімі сваімі ворагамі, колькі ў церпячай ролі рашучага працїўніка, бойка баронячага жыцьцё, маемасьць і зямлю сваіх людзей (грамадзян) ад барбарскага вынішчэньня іх паўдзённа-русамі і полаўцамі. Ён пераносіць беды й цярпеньні ад другіх людзей значна больш, чым сам іх прычыняе.

Вось чаму й «Слова аб палку Ігаравым» ў асобе Усяслава бача недасяжны прыклад і высокі ідэал для ўсіх ягоных патомкаў, тым больш, што апошнія паказаліся недастой-

1) Нямігa — адны гісторыкі кажуць, што гэта р. Нёман, а другія лічаць Нямігай тую рэчку, ад каторай каля Менску астаўся ручаёк Нямігга, які ўліваецца ў раку Сьвіслач.

нымі свайго вялікага дзеда, «выскочили из его славы», маладушна скланіўшы прад ворагамі свае сьцягі і злажыўшы ў похвы свае вышчэрбленыя мечы.

Такім чынам, калі водклік аўтара «Слова» аб Усяславе параўнаць з усей характарыстыкай гэтага-ж князя, дык абраз яго, як князя бязлітаснага, павінен зьнікнуць.

Яшчэ больш няправільнай пакажыцца летапісная характарыстыка Усяслава, калі прыняць пад увагу дакладныя цыфровыя дадзеныя з хронолёгіі ягонага княжэньня. Вышэй паказаны крывавы рад гадоў (1065—1070, 1077—1078 г.г.) барацьбы Усяслава з Яраславічамі не прадстаўляе нават пятай часьці ўсяго ягонага княжэньня, якое абыймае больш, як поўвекавы пэрыяд часу (1044—1101). На працягу 10—цёх гадоў княжэньня Яраслава Мудрага (1044—1054) і ў першае дзесяцігодзьдзе панаваньня ягонага сына Ізяслава (1055—1065) Полацкі князь жыў у поўнай згодзе з Кіевам. Пад 1060 годам успомнены ў летапісе нават супольны паход трох Яраславічаў з Усяславам проціў Тюркаў (народ тюрка - татарскага паходжаньня), які давёў гэтых качаўнікоў блізу да поўнай гібелі. Гэткае ўчасьце Усяслава ў агульна-народнай абароне рускай зямлі й яшчэ маладой ейнай культуры ад націску дзікіх сьцяповых грабежнікаў у той час, калі сама Полаччына ўжо пачынала цярпець ад нападаў Літвы, загадвае сумлівацца, як мог Усяслаў парваць доўгалетні (1044—1064) саюз з Кіевам без паважных да гэтага прычын, а толькі пад уплывам краважаднага інстынкту заваяваньня або з прычыны нездаволенага пачуцьця гонару.

Летапісная хронолёгія паказвае, што цэлыя сорак гадоў княжэньня Усяслава прайшлі спакойна, бяз крывавых сутычак з паўдзённа-рускімі князямі,—знача княжэньне было пасьвячана культурнай рабоце. Магутным адгалоскам народнай памяці аб гэтай нутранай канструктыўнай дзеяльнасьці Усяслава зьяўляецца сказ у «Слове»:

„Всеслав князь людям судяше, князем грады рядяше".

Гэтым сказам, па першае, падчырківаецца дзейнае ўчасьце Усяслава ці то асабістае, ці праз намесьнікаў, і цівуноў, пры разборы ўсялякага роду справаў і жалабаў, узьнікаўшых сярод народу, сярод гарадзкіх і сельскіх жыхароў Полацкага княства, а, па другое,—словамі «князем грады рядяше»,—падчырківаецца кіруючая гаспадарственная дзейнасьць Усяслава, якая праяўлялася ў разьмяшчэньні па ўдзелах Полацкага княства многалічных з ягонай сям'і сыноў, унукаў і праўнукаў на падставе «рядов»[1]) ці дагавораў, на што патрэбна было глыбокае знаёмства індывідуальных свомасьцяў князёў, дакладнае знаёмства мясцовых патрэбаў, жыцьцёвы досьлед, гас-

1) Слова „рядить" у стараславянскіх памятніках абазначае — кіраваць, упраўляць, распараджацца.

падарственная тактоўнасьць, што й азначаецца, як характэрная рыса Усяслава.

Тая самая летапісная крыніца дае цьвёрдыя падставы лічыць князя Усяслава, як першага будаўнічага аднаго з найстарэйшых і найцаньнейшых царкоўных памяткаў Беларусі, пайменна — саборнага храма сьв. Софіі ў Полацку.

„Тому в Полотське, — кажа „Слово", — позвониша заутреню рана у Сьв. Софіі в колоколы, а он в Кыеве звон слыша".

Каб ясна зразумець гэта месца «Слова», трэба мець на воку, што Усяслаў ад м-ца ліпня 1067 г. аж да красавіка 1069 г. знаходзіўся ў Кіеве, спачатку, як ваенна-палонны, у цёмным падвале, а пасьля,—як вялікі князь (у 1068 г. Кіеўляне паўсталі проціў вял. князя Ізяслава й прагналі яго, а на вялікакняскі пасад узьвялі Усяслава Полацкага, прад тым пасаджанага старшымі князямі ў вязьніцу).

І тут якраз Усяслава, як гарачага патрыёта, відавочна мучыла туга за бацькаўшчынай, за Полацкай Софіяй, якая асабліва дарагая была ягонаму сэрцу, як ейнаму будаўнічаму, што нават гук Софійскіх званоў быў добра знаёмы княжаму слуху, бо-ж Усяслаў быў і фундатарам гэтых-жа званоў.

«Слова аб Палку Ігаравым» паэтычна паказала гэту «тугу за бацькаўшчынай« Полацкага князя ў пекным мастацкім сымболю чараўніцкага чуцьця князем здалёку знаёмага пераздону Софійскіх званоў. Гэта напамінаньне аб Полацкай Софіі адносна часу аказваецца самым старадаўным дакумэнтам, з якога адкрываецца, наколькі Софійскі храм блізкі быў сэрцу Усяслава Брачыславіча.

Адпадае так-жа ўсякая тэндэнцыя прадставіць князя Усяслава «немилостивым на кровопролитие», жорсткім, бо паводле дакладнага хроналёгічнага аблічэньня, як вышэй ужо было ўспомнена, нават пятая часьць ягонага княжэньня ня была праведзена на войнах.

Калі мы бліжэй і глыбей удумаемся ў глыбейшыя матывы сутычкі Усяслава з Яраславічамі, дык пабачым, што ў крыві Усяслава, як аднаго з Рогваладавічаў, жыла пастаянная, прыродная, стыхійная ненавісьць да Яраславічаў. Ягоная душа жадала крывавай радовай помсты за зьняважаную чэсьць Рагнеды, насільна аддадзенай замуж за Кіеўскага князя Уладзімера, і за забойства ваяводам Дабрынёю ейнага бацькі, маткі і двух братоў. Усяслаў вельмі добра разумеў, што пагалоўнае вынішчэньне мужчынскага пакаленьня Рогвалада ня было выпадковым рэзультатам жорсткай мсьцівасьці Дабрыні ці звычайнай праявай фізычнай сілы заваяваньня з боку Кіева: даводзячы да ваенна-тэрыторыяльнага захапленьня Рогваладавых земляў, яно ў сапраўднасьці азначала палітычную сьмерць Полацкага княства, як самастойнага гаспадарства. Вот чаму ў часе княжэньня Усяслава трагічная барацьба Кіева з Полацкім княствам дасягае крайняга напружаньня.

І пакуль на чале Полацка стаяў Усяслаў, датуль, натуральна, ягоная нясчэрпаная энэргія, нязломная воля й львіная адвага, апёртыя пры гэтым на магутнае падтрыманьне Полацкай краёвай сілы, служылі надзейнай запорай, саставлялі моцнае апірышча проціў захопніцкіх плянаў Кіева.

Па сьмерці Усяслава ў гісторыі ўзаемаадносінаў Палачанаў і Паўдзённа-Русаў азначаецца пералом. Ужо ў другой палавіне княжэньня Усяслава, калі на паўдзённым кругазоры Русі праціўнікам Полацкага князя Усяслава зьяўляецца Уладзімер Манамах, ваенныя сутычкі Полацка з Кіевам замест дагэтуляшняга зачэпніцкага набываюць характар абаронны. Бязспрэчная перавага паўдзённай коаліцыі над Усяславам у другой палавіне княжэньня, асабліва ад 1077 г., калі ваенныя й матарыяльныя сілы Полацкага княства ў напружанай барацьбе былі даволі вычэрпаны, паказалася ў жорсткім спусташэньні Полаччыны войскамі коаліцыі й у разгроме цэлага раду гарадоў — Менска, Друцка, Полацка і інш.

Паходы сына Уладзімера Манамаха — Мсьціслава — на Крывічоў у 1127 і 1129 г.г. былі сумнай разьвязкай трагічнай векавой барацьбы Рогвалодавічаў з Яраславічамі.

Калі ў 1129 г., на наказ Кіева прыняць учасьце ў паходзе на полаўцаў, Усяславічы адказалі адмоўна, засланяючыся мноствам сваіх хатніх неадкладных спраў у Полацкім княстве, тады вялікі князь паддаў іх бязпрыкладнай жорсткай кары. Блізу ўвесь род Усяславічаў у асобах галоўных ягоных прадстаўнікоў, разам з іхнімі жонкамі і дзяцьмі, быў на прыказ разгневанага князя схоплены й высланы з Краю аж у Царгорад, а Полаччына, як звычайны удзел Манамахавічаў, была аддадзена пад уладу вялікакняскіх намесьнікаў, на чале з Ізяславам, сынам вялікага князя. Гэта згнаньне і было эпілёгам крывавай барацьбы Рогвалодавых унукаў з унукамі Яраслававымі у XI—XII в.в.

Пачаўшы ад пагалоўнага вынішчэньня Дабрынёю мужчынскага караня Рогваладавага патомства, г. зн. ад фізычнай, так сказаць, сьмерці Полацкай княскай дынастыі, гэта барацьба заканчываецца так-жа пагалоўнай высылкай з роднага краю узноўленага, ужо па жаноцкай лініі, таго самага патомства, г. зн. цывільнаю сьмерцю дынастыі. Гісторыя аднак даказала, што, незважаючы на нязвычайнасьць гэтак выняткавых мерапрыемстваў, Мсьціслаў, падобна як і Дабрыня, зусім не патрапіў дасягнуць намечанай мэты... Вынішчанае Дабрынёю мужчынскае пакаленьне князя Рогвалада, як ведама, узноў аджыло па жаноцкай лініі, узноў ускрэсла ў асобах многалічных прадстаўнікоў Рагнедзічаў, каторыя й аселі ў удзелах Полаччыны, абноўленай самым-жа Уладзімерам. Таксама й сасланы ў Грэцыю род Рогваладовічаў хутка па сьмерці Мсьціслава (15.IV.1132 г.) узноў зьявіўся ў родным горадзе й вярнуў сабе правы на Полацкі пасад пры маўклівай згодзе

вялікага князя. Як у 1070 г. князь Усяслаў, у той час бедны бяздомнік і палітычны згнаньнік, прагнаў з Полацкага пасаду накіненага Крывічом Сьвятаполка Ізяславіча, так у 1133 г. выгнаны быў з Полацка другі Сьвятаполк, сын Мсьціслава, заменены ўнукам Усяслава — Васільком.

Такім чынам, прасьледзіўшы коратка аснаўны ход барацьбы ўнукаў Рогвалада з унукамі Яраслава, мы можам зрабіць безпамылковы вывад, што гэты векавы працэс трэба разглядаць не як прадукт асабістых узаемаадносінаў двух княскіх родаў, не як рэзультат самай толькі ініцыятывы й жалезнага характару Усяслава, але як цьвёрдая і няўклонная абарона Крывічамі сваей самабытнасьці, сваей свабоды, свайго палітычнага й соцыяльнага ладу. У гэтай барацьбе асабліва выразна паказалася лучнасьць князя з народам.

Ацэньваючы роль самага Усяслава ў гэтых падзеях, можна сказаць, што ў ягонай асобе на гістарычную арэну выступіла фігура выразнай сілы й хараства, асоба моцная сваім розумам, энэргіяй і творствам... З рэдкай унікліваасьцю князь гэты згадываў схаваныя замыслы Яраславічаў аб Полаччыне і разам з тым выразна прадстаўляў сабе ейныя вялізарныя беды, жыва адчуваў ейныя рэальныя патрэбы, зорка прыглядаўся ў неадкладныя задачы будучага ейнага існаваньня й разьвіцьця.

Падобна ўсім наагул гістарычным тыпам, Усяслаў Брачыславіч ня толькі патрапіў павязаць, аформіць і надаць кірунак асобным здарэньням роднай гісторыі, але пасьпеў прысьпяшыць самы іхні ход. Быстра апанаваўшы думку й настроі народных масаў, ён зварухнуў сучасныя сабе грамадзкія сілы й знайшоў натуральны выхад для іхняй багатай і ўтоенай энэргіі. Увесь глыбокі свой розум, усю вытрываласьць волі, кіпучую гарачасьць тэмпэрамэнту Усяслаў аддаў на служэньне дабрабыту Полацкага княства, цалком пасьвяціўшы сябе абароне свабоды Полацка, геройскай абароне яе ад прэтэнсыяў Кіева.

Дзеля гэтага безстаронны дасьледчык ніколі ня можа, насупроць летапіснаму паведамленьню, назваць Усяслава ініцыятарам і вінавайцам крывавых спрэчак паміж Полацкам і Кіевам; гэта барацьба з Кіевам асталася Усяславу ў спадчыне з часаў ранейшых і прычыны ейныя закарэнены выключна ў імкненьні Кіеўскіх князёў падпарадкаваць сваім уплывам аграмадныя прасторы Полацкага княства з ягонымі удзеламі.

Ня можна, бяз сумніву, не згадзіцца, што выдатная роль Усяслава ў гісторыі Беларусі ў значнай меры стварылася шчасьлівым і трафным спалучэньнем ягонага аблічча духовага, ягоных палітычных і эканамічных ідэалаў з аднаго боку, і племянных і гаспадарскіх імкненьняў Палачан — з другога. Гэтым рэдка трафным спалучэньнем і аб'ясьняецца чынная падтрымка й самаахвярная вернасьць Палачан для роду Раг-

недзічаў, іхны патрыятычны настрой, гарачая любоў да родных ніваў, вернасьць сямейным асяродкам і геройская рашучасьць перамагчы або памерці, баронячы сваю грамадзкую й палітычную незалежнасьць. Гэтыя самыя абставіны ператвараюць Усяслава ў магутнага арганізатара мясцовых краёвых сілаў, зрабілі з яго носьбіта й выразіцеля народнай волі й вытварылі яму разам з тым славу народнага любімца, непераможнага павадыра, магутнага чарадзея.

Гэту праяву прыгожай гармоніі між кіруючымі кругамі й грамадзянствам усей Полаччыны характарызуе дальшы ход Полацкай гісторыі (XI—XIII в.в.). Ужо даўна заўважылі гэта расейскія вучоныя дасьледчыкі, напр. В.Е. Данілевіч і Пассек. Аднак моцная й дружная падтрымка Полацкімі краёвымі сіламі Рогвалодавічаў у іхняй барацьбе з Яраславічамі зусім не абязцэньвае вялікага ўкладу ў гэту справу князя Усяслава Брачыславіча.

Князь Усяслаў быў ня толькі сынам свайго народу, але сынам вельмі здольным, аказаўшым свайму народу вялізарную й неацанімую ўслугу; ён ня толькі быў носьбітам грамадзкай думкі і выразіцелям народных патрэбаў, але й дамінуючым, незалежным характарам, які мог пацягнуць грамаду сілай сваей творчай ініцыявывы, цьвёрдай воляй і жалезнай энэргіяй. Усяслаў Брачыславіч астаўся да канца верным гэнай палітычнай ідэі — ідэі незалежнасьці й самабытнасьці свайго княства, пад знакам каторай прайшло больш чым поўвяковае ягонае служэньне Полаччыне.

Дзеля гэтага няма дзіва, што князь Усяслаў нарысаваны ў дасьціпнай сазе[1]) і апяяны народнай песьняй іменна, як адважны змагар за крывіцкае племя і як гарачы абаронца »бацькаўшчыны Рагнеды" ад прэтэнсіяў і крыўдаў князёў кіеўскіх.

Усяслаў высака падыймаецца на гістарычнай сцэне і сходзіць згэтуль стройнай і самапэўнай фігурай, дакладна вытрыманым і верны свайму характару.

У глыбокай старасьці, акружаны многалічнай сям'ёй сваіх сыноў і ўнукаў, Усяслаў быццам адходзіць ад кіпучага палітычнага жыцьця удзельна-вечавой пары (пэрыяду), але затое ўсёцэла аддаецца дамовым справам свайго княства. Ня трывожаны ворагамі ў часы княжэньня баязьлівага кіеўскага Сьвятаполка II (ад 1093 г.), накідаючы ім страх і пашану, Полацкі Чарадзей мірна дажывае рэшту сваіх дзён, як няўтомны сторраж і верны абаронца бацькаўшчыны Рагнеды.

Так, Полаччына, не зважаючы на адвагу й храбрасьць, як Усяслава Брачыславіча, так і другіх сваіх князёў, не ўстаяла проціў націску паўдзённа-рускай коаліцыі. Але гэта ня была віна Усяслава Брачыславіча! Полаччына, пасьля таго, як абласьці Ноўгародзкая і Пскоўская падпалі пад уплыў кіеўскіх

1) Сага — казка гістарычная.

Яраславічаў, апынулася ў небясьпечным палажэньні: яна сталася географічнай церазпалосіцай паміж паўночнымі й паўдзённымі землямі кіеўскага князя. А ведама, што церазпалосіца заўсёды служа яблыкам нязгоды, робіцца арэнай крывавых спатычак пляменаў і іхніх павадыроў, прычым жыхары такой церазпалосіцы нярэдка ня толькі трацяць вонкавую палітычную свабоду, але нарушаецца і ейны ўнутраны самабытны ўклад грамадзкага жыцьця. Гэткім ёсьць закон гістарычнай канечнасьці, каторы няўклонна прасьледуе беларускі народ і па сягоньняшні час.

Незалежнае Полацкае княства было сапраўды географічнай запорай для зьбірацельскіх палітычных задач Яраславічаў, якія ўпарта імкнуліся да аб'еднаньня ў адно цэлае гаспадарства (дзяржаву) цэлага раду вагромных абшараў уздоўж рэк і вазёраў «вялікага воднага шляху.“

Упартае процідзеяньне зьбірацельскай сіле Кіева — гэта палітычная істота старадаўнага княжага Полацка з часоў X—XII в.в. Тут дзеля таго трэба шукаць глыбокіх каранёў трагічных сутычак і ваенных парываў Усяслава Брачыславіча, для вытлумачэньня якіх перапужаныя Ноўгарадчане пасьпелі злажыць сваю слаўную казку аб прыроднай, выйшаўшай з чарадзейскага нараджэньня, няміласэрнасьці князя Усяслава на праліцьцё крыві.

Трэба адзначыць, што пагляд на векавую, бязпрыкладна жорсткую спрэчку паміж унукамі Рогвалада і Яраслава іменна, як на барацьбу полацкіх князёў і Крывічоў за сваю незалежнасьць ад Кіева, — мае ў расейскай гістарычнай навуцы вельмі моцную і даўную традыцыю. Цікава, што гісторыкі самых розных кірункаў сходзяцца ў такім азначэньні аднае з істотных свомасьцяў дасьледжванага намі гістарычнага зьявішча. Гэтак, гісторык Н. М. Карамзін кажа:

»Полацкія князі здаўна аддзяліліся, так сказаць, ад Расеі, хочачы быць уладарамі незалежнымі»[1]).

Н. Устрялов разьвівае такую думку:

«Усяславічы, раней чым другія патомкі Уладзімера Сьвятога, хацелі быць незалежнымі і, не прызнаючы пяршынства вялікага князя кіеўскага, бязупынна працівіліся дому Яраслава Мудрага»[2]). Гэты самы пункт гледжаньня падзяляе і праф. В. Б. Антановіч, кажучы:

«Раней іншых рускіх земляў выдзялілася ў родзе Ізяслава Уладзіміравіча вобласьць Полацкая.[3])

Тыя самыя думкі выказваюць: О. Турчинович,[4]) И. Зеленскій, Д. Я. Самоквасов і інш.

1) „Исторія Государства Россійского,“ бач. 173.
2) „Русская Исторія, ч. I, выд. 1855, бач. 95.
3) „Монографіи по исторіи Западной и Юго-Западной Россіи,“ т. I, Кіеў 1885 г. бач. 18.
4) „Обозрѣніе исторіи Бѣлоруссіи с древнѣйших времён, 1857 г. бач. 38.

Урэшце наагул трэба сказаць, што на княжэньне Усяслава Брачыславіча (1044—14.IV.1101) трэба глядзець, як на пэрыяд прабуджэньня ў Полаччыне дрэмлючых сілаў палітычнай цэнтралізацыі. Сьмелы, храбры й рашучы Усяслаў быў дастойным выразіцелям цэнтра-гонных грамадзкіх і палітычных плыняў у Полацку. Гэтак сама характарызуюць Усяслава і вучоныя-гісторыкі. Так, праф. И. Д. Беляеў кажа:

„Усяслаў быў самым ваяўнічым, няўтомным і знаходчывым з усіх сучасных яму князёў рускіх; ягоныя ваенныя перамогі, ягоная ўмеласьць выходзіць з небясьпекі і пасьля няўдачы ня траціць надзеі, а рабіцца йшчэ сільнейшым, аславілі яго, як чараўніка, каторага жалеза не бярэ і каторы абяртаецца ў шэрага ваўка, носіцца па палёх і лясох нябачаным там, дзе яго не чакалі і чакаць не маглі[1]). Праф. Доўнар-Запольскі гэтак адзываецца аб князю Усяславе:

«Сваім розумам, сваім няўтомным, прадпрыемчывым характарам гэты князь астаўся на доўга ў памяці народу; аб ім пачалі ўжо хадзіць легенды, як аб чарадзею; апавяданьні гэтыя, перадаваныя ў народзе, папалі ў памятнікі пісьменства—летапісы і «Слова аб палку Ігаравым[2]). У такім-жа родзе дае характарыстыку Усяслава Полацкага В. Е. Данілевіч:

„Наагул Усяслаў зьяўляецца аднэй з найбольш сьветлых асабістасьцяў свайго часу, і няма дзіва, што ўваччу сучасьнікаў ён зьяўляецца нейкай істотай надпрыроднай, чарадзеем і перакіншчыкам»[3]).

Наступнікі князя Усяслава не змаглі, як ужо вышэй было зазначана, і з прычын ад іх незалежных, даць адпор жорсткаму націску паўдзённа-рускага цэнтралізму. Аднак, згуба абласной самастойнасьці аказалася кароткачасовым зьявішчам у Полацкай гісторыі. У хуткім часе яна ўзноў атрымоўвае законамерны ход. Асвабадзіўшыся ад Кіеўскай апекі, Полаччына распадаецца на удзелы, а ў пачатку XIII ст. разам з ваяўнічымі літоўскімі плямёнамі творыць магутнае Літоўска-Беларускае Гаспадарства.

---

1) „Очерк исторіи Сѣверо-Западнаго Края Россіи," Вільня 1867, бач. 20—21).

2) „Очерк исторіи Кривичской и Дреговичской Земель до конца XII ст.", Кіеў, 1891, бач. 77.

3) „Очерк исторіи Полоцкой Земли до конца XIV ст.," Кіеў, 1896, бач. 63—64.

Кнігапіс

Віра Свенціцка **„Різьблені ручні хрести XVII—XX в. в."** Ч. I-II, Львоў, 1939. (**„Збірки Національного Музею у Львові"**). Выданьне Саюзу Прыхільнікаў Нацыянальнага Музэю ў Львове.

У ч. I сваёй працы аўторка разглядае ручныя галіцкія крыжы (XVII—XX в. в.), якія знаходзяцца ў ліку са 230 у Нацыянальным Музэі ў Львове. Ч. II зьмяшчае ілюстрацыі.

З працы даведываемся, што галіцкія крыжы адзначаюцца наагул прасьцінёй выкананьня й кампазыцыі і ўступаюць значна з мастацкага боку крыжом наддняпроўска-украінскім. Асяродкамі вырабу крыжоў, як трэба думаць, былі ў першую чаргу манастырскія майстроўні. (Манявські Скіт, Крэхоўскі й Кіеўскі манастыры). Аб гэтым мы можам судзіць перадусім на падставе гістарычных жарол. Напр. у канцы 1657 г. ігумен Крэхоўскага манастыра прывёз цару Аляксею Міхайлавічу мошчы сьв. Барбары й Сьцяпана, „6 ложок и 2 креста рѣзныя". Вядомы йзноў-жа дрэварыт крэхоўскага ігумена Сенкевіча з 1699 г. Відаць, там была цэлая граверная школа! На падставе досьледаў О. Т. Сьцяпанавай („Матеріяли до вивчення української деревляної різьби" — „Мистецтвознавство" т. I, Харкаў, 1928(29) выглядае аднак, што кіеўскія крыжы выраблялі майстры-мяшчане.

З агульнага ліку датаваных ёсьць 72 крыжы. Даты на іх зьяўляюцца вельмі важнымі ор'ентацыйнымі пунктамі пры азначэньні часу іншых недатаваных крыжоў, што ёсьць наагул вельмі трудным. Часта крыжы аднаго тыпу паўтараюцца на працягу больш сотні гадоў і, азначаючы іх час на падставе іканаграфічна-стылістычных рысаў, можна памыліцца. У даным выпадку мы маем факт існаваньня пэўнага асяродку вырабу, які захаваў доўгі час традыцыю.

Далей аўторка дакладна разглядае графічны, кампазыцыйны, тэматычны бок крыжоў, іх будову, надпісы на іх, часовае паходжаньне і т. п., параўноўваючы часта крыжы галіцкія з іншымі й выкарыстоўваючы адпаведную літаратуру. Можа за мала, на наш пагляд, адзначаны ўзаемныя ўплывы й сувязь народнае разьбы й разьбы разгляданых крыжоў. Гэта аднак вымагала-б значнага пашырэньня досьледаў, што не ўваходзіла наагул у заданьне працы. Пры чытаньні працы гр. Веры Сьвенціцкай мімаволі насоўваецца думка, каб і беларускія дасьледавальнікі заняліся распрацоўкай іконаграфічных скарбаў Беларускага Музэю ў Вільні. У іх працы прыгожая кніжка аб галіцкіх крыжох была-б неабходнай і вельмі карыснай.

Хв. І—ч

З ЖАЛОБНАЕ КАРТЫ

Ляля Мэнке

(*пасьмертны ўспамін*)

З маладога пакаленьня мала хто ведаў Яе, але старэйшыя беларускія дзеячы добра памятаюць тую працу, якую нябожчыца ахвярна давала беларускай справе падчас сусьветнае вайны й нямецкае акупацыі.

Быбух сусьветнае вайны пазбавіў Беларусаў шмат чынных работнікаў на нацыянальнай ніве, пакліканых у армію. Эвакуацыя Вільні Расейцамі забрала блізу цалком рэшту нашых актыўных сіл у сталіцы нашага краю. У Вільні асталіся лічаныя адзінкі. А тым часам жыцьцё вымагала вялізарных высілкаў, каб ня толькі ня даць заняпасьці беларускай справе, але каб належна выкарыстаць дзеля яе новыя абставіны: у першую чаргу трэба было арганізоўваць беларускія школы, далей — беларускі тэатр і іншыя культурныя установы й арганізацыі.

У гэтую важную для Беларусаў часіну ўвайшла ў беларускую сям'ю маладая, поўная сіл, жыцьцярадасная Ляля (Эмілія-Люцыя) Мэнке. Сям'я Мэнкаў — гэта сям'я нямецкая, якая ад вякоў асела на зямлі Беларускай і крэпка з гэтай зямлёй і з народам беларускім зраслася. У доме Мэнкаў Беларусы заўсёды сустракалі добрае прыймо і маральнае падтрыманьне. А маладое пакаленьне Мэнкаў дык станула й да чыннае беларускае працы.

Ляля Мэнке ў першую чаргу пачала працаваць у ладжаных у Вільні беларускіх школах, у якіх — згодна з вымогамі акупацыйных уладаў — выкладала, як прадмет, нямецкую мову. Прыймала чыннае ўчасьце і ў розных іншых працах тагачаснага беларускага цэнтру — Беларускага Камітэту помачы ахвярам вайны. Але найбольш ярка выявілася яе дзеяльнасьць на грунце беларускага тэатру, арганізаванага Ф. Аляхновічам пры Беларускім Клюбе. Ляля Мэнке заняла ў ім першае месца. Маючы невялікі, але вельмі мілы голас, яна выступіла перад усім у камэдыі-апэрэтцы Аляхновіча «На Антокалі», іграючы вельмі ўдала ролю Зоські. Далей пайшлі іншыя п'есы, у якіх Ляля Мэнке выступала з вялікім пасьпехам, здабываючы агульную сымпатыю.

Як адзінка высока-культурная, інтэлектуальна разьвітая, да таго-ж з вельмі мілым характарам, Ляля Мэнке гуртавала каля сябе ня толькі моладзь, але й старэйшае грамадзянства. У доме Мэнкаў часта можна было спаткаць і прыезных нямецкіх навукоўцаў, каторым Ляля — разам з старшай сястрой сваей Юльянай, вельмі актыўнай працаўніцай

у беларускіх грамадзкіх арганізацыях, школах і курсах, — давала рэвэляцыйныя для чужынцаў інфармацыі аб беларускім народзе, яго мінуўшчыне, культуры і імкненьнях. Але актыўная праца Лялі Мэнке трывала нядоўга. На 21-ым годзе жыцьця ў яе пачала разьвівацца страшная хвароба — сухоты, асабліва небясьпечная ў маладым веку. Толькі дзякуючы адданасьці й апецы старшае сястры хвароба гэтая на нейкі час прыпынілася. У 1919 годзе Ляля Мэнке гэтак ужо паправілася, што павязла паміраўшага ад тых-жа сухотаў Івана Луцкевіча ў Закапанае і апекавалася ім — супольна з Юльянай — аж да апошняе гадзіны ягонага жыцьця.

Вярнуўшыся пасьля сьмерці Ів. Луцкевіча ў Вільню, Ляля Мэнке ўжо ня мела сілаў дзеля ўзнаўленьня грамадзкае працы. Праз некалькі гадоў выйшла замуж за інж. Кулешу і жыла да сьмерці ў вузейшым сямейным коле. Але грамадзкімі справамі, а ў першую чаргу беларускімі, цікавілася да апошняга дня свайго нядоўгага жыцьця. Канаючы ў поўнай сьвядомасьці й разьвітываючыся з сваей раднёй, яна не забылася й аб прыяцелях Беларусах, з каторымі некалі супрацоўнічала, і прасіла пераказаць ім сваё апошняе разьвітаньне.

Памерла 21 чэрвеня — на 43-ім годзе жыцьця. 23-га чэрвеня адбыліся яе пахароны на эвангеліцкім магільніку. Вялікая розназычная грамада людзей праводзіла яе да магілы, а сярод іх — цэлы рад старых беларускіх дзеячоў побач з прадстаўнікамі беларускае моладзі. Літаратурна-мастацкая сэкцыя Бел. Навук. Т-ва ўзлажыла на магілу Лялі Мэнке вянок з жывых красак.

Ляля Мэнке пакінула добрую памяць аб сабе сярод Беларусаў і добра заслужылася беларускай справе. Сьмерць яе выклікала глыбокі жаль сярод усіх, з кім яна некалі супрацоўнічала.

Няхай лёгкай будзе ёй наша зямелька, каторая была для яе запраўды роднай!

А. Луцкевіч

Супрацоўнікі «Калосься»: *В. Багдановіч, А. Бужанскі, А. Бярозка, М. Васілёк, Ст. Грынкевіч, А. Дубровіч, Хв. Ільляшэвіч, А. Івэрс, С. Каліна, А. Клімовіч, Я. Крыга, М. Машара, М. Пяцюкевіч, С. Сахараў, Кс. А. Станкевіч, Я. Станкевіч, П. Сірата, П. Сергіевіч, М. Танк, С. Хмара, А. Чэмер, Ул. Чэмер, М. Шкялёнак, Р. Шырма.*

Redaktor-Wydawca Jan Szutowicz Рэдактар-Выдавец Ян Шутовіч

Прысланыя кніжкі й часапісы

Сяргей Хмара— **Жураўліным шляхам.** Вершы. Вільня, 1939.
Börje Colliander — **Ranafolken.** Гэльсінгфорс, 1938.
Богословія, кн. 1. Львоў.
Вістник, кн. 6, 7—8. Львоў.
Ми, кн. 3(10). Варшава.
Живе Слово, 3, 4. Львоў.
Рідна Мова, ч. 6, 7, 8. Варшава.
Lietuviškas Baras, № 4, 5. Вільня.
Dailės Parodos Katalogas. Коўна.
Orientalia Christiana periodica, vol. V. Рым.
Oriens, сш. 3, 4. Варшава.
Ruch Słowiański, № 3—4, Львоў.
Droga pracy, № 2, 3, 4, 5. Крамянец.
Kamena, 8—10. Хэлм Люблінскі.
Nasza Przyszłość, № LXX—LXXII. Варшава.
Sygnały, №№ 67—73. Львоў.
Mosty, № 3, Варшава.
Polityka, №№ 7—22. Варшава.
Ziemia Lidzka, №№ 4—5, 6, Ліда.
Fontana, № 4, 5, Катовіцы.
Wilno, № 1, 2, Вільня.
Slavische Rundschau, № 1—2, Прага.
Katolik, ч. 6—13, Прага.
Летопис Матице Српска, сш. 4, 5—6, Новы Сад.
Hrvatska Revija, №№ 5, 6, 7. Загрэб.